№ 4 (650) 27 студзеня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

першая беларуская газета

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**«З адстаўкай Уладзіміра Саўчанкі яго родны горад атрымаў шанец»**

Старонка 2



**Пацяпленне клімату**

Старонка 5




**Ціхія Міроны**

Старонка 8


**У НУМАРЫ**

**«Залаты адвакат» пад следствам**

Суд над вядомым сталічным адвакатам абяцае скандалы і выкрыцці.

«Пры сярэднім заробку 1,5 млн руб. адвакат ездзіць на «VW Touareg» 2006 года выпуска, яго жонка — на новым джыпе. Сям'я валодае цалкам абстаўленай чатырохпакаёвай кватэрай, будуе катэдж у Мінскім раёне. Дзе можна зарабляць такія грошы?». **Старонка 6.**

**Апякліся на малацэ**

У дзясятцы самых стратных адкрытых акцыянерных таварыстваў Беларусі дзевяць пазіцый займаюць малочныя камбінаты. **Старонка 4.**

**Краіна Лачплесіса ваюе з крызісам**

**Старонка 12.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Івянец не прагнуўся

Тарэсу Собаль перавыбралі. Стаўленніка лукашэнкаўцаў у Саюзе палякаў Станіслава Сямашку нават не пусцілі ў будынак.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**На пярэднім плане Анжаліка Борыс (злева) і Тарэса Собаль.**

Сходу папярэднічаў псіхалагічны націск на ранейшае кіраўніцтва і тых сяброў СПБ, якія вырашылі падтрымаць Тарэсу Собаль.

Супраць Собаль распачалі крымінальную справу. Маўляў, не сплаціла падаткаў з матэрыяльнай дапамогі, якую атрымаў аддзел СПБ. Напярэдадні мясцовая раёнка надрукавала на першай паласе інфармацыю аб выключэнні спадарыні Собаль з Саюза палякаў С.Сямашкі, а ўвесь Івянец быў залеплены абвесткамі аб хуткіх выбарах новага кіраўніцтва.

**Старонка 9.**

# Першы палітык распачынае прэзідэнцкую кампанію

Алесь Міхалевіч хоча стаць голасам маладога пакалення.

27 студзеня аб пачатку сваёй прэзідэнцкай кампаніі афіцыйна абвесціць палітык Алесь Міхалевіч.

**Алесь Міхалевіч**

Нар. у 1975. Ён з сям'і навукоўцаў. Быў адным з першых выпускнікоў Коласаўскага ліцэя. Скончыў БДУ па спецыяльнасці паліталогія, праходзіў стажыроўкі ў Варшаве і Оксфардзе. Быў заснавальнікам Задзіночання беларускіх студэнтаў, доўгі час знаходзіўся ў Партыі БНФ. Быў дэпутатам Пухавіцкага райсавета. Жанаты, мае двух дачок.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

За год да выбараў ён стане першым апазіцыянерам, які кідае выклік Лукашэнку.

Міхалевіч мае разгалінаваную геаграфію прыхільнікаў. Яны ёсць не толькі ў сталіцы, але і ў малых гарадах, такіх, як Горкі, Светлагорск, Белаазёрск.

Палітык таксама мае добрыя сувязі ў Еўропе.

Лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч яшчэ не вызначыўся са сваім удзелам у прэзідэнцкай кампаніі, таму Міхалевіч гатовы стаць галоўным кандыдатам на выбарах ад нацыянальна-дэмакратычных сілаў. Вылучэнне Міхалевіча — гэта заяўка на лідэрства ў апазіцыі на наступныя гады.

Галоўныя плюсы Міхалевіча — гэта маладосць і мабільнасць. На з'ездзе Партыі БНФ палітык абяцаў, што подпісы за яго будуць збіраць людзі, якія раней не былі ў палітыцы.

Пад якімі лозунгамі Міхалевіч пойдзе на выбары, стане вядома на прэзентацыі. Яе падрыхтоўка ахутана густой заслонай сакрэтнасці.

**Зміцер Панкавец**

## Расія прапануе Беларусі ўлезці ў крэдыт яшчэ на $2 млрд

Гэтых грошай хопіць на выплату нафтавых мытаў.

Віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка зноў у Маскве. Але чарговы дзень нафтавых перамоваў 25 студзеня не даў вынікаў.

Як заўсёды, актывізаваліся «крыніцы, блізкія да расійскага боку». Раней яны намякалі праз прэсу, што «цікавыя» купляй «Нафтана». Цяпер жа Расія быццам бы гатова выдаць крэдыт на $2 мільярды. Грошай якраз павінна хапіць на выплату новых мытаў, якія хочуць увесці расіяне.

Фактычна Расія прапануе перайсці на новыя правілы гульні, але адцягнуць плацяжы на некалькі гадоў.

Пастаўкі нафты ў беларускім кірунку ўжо зменшыліся. Калі яны не адновяцца ў ранейшым аб'ёме, нафтаперапрацоўчыя заводы могуць стаць.

**Ягор Марціновіч**

# Саўчанка падаў у адстаўку

**Кіраўнік гродзенскай вертыкалі Уладзімір Саўчанка сышоў з пасады па ўласным жаданні.**

Як паведамляе прэс-служба Лукашэнкі, адстаўка старшыні Гродзенскага аблвыканкама звязаная са станам здароўя. Саўчанка папрасіў «перавесці яго на працу з меншым аб'ёмам задач». Аблвыканкамам будзе пакуль кіраваць першы намеснік Саўчанкі Іван Жук.

Гродзенскі журналіст Андрэй Пачобут кажа, што чуткам пра сыход Уладзіміра Саўчанкі з пасады кіраўніка вобласці ўжо гадоў пяць. А той кіраваў Гродзеншчынай ад 2001 года, заняўшы пасаду пасля смерці Аляксандра Дубко.

«Такога кіраўніка, як Саўчанка, ужо не будзе. Яго адмыслова сюды прыслалі «навесці парадак», — мяркуе Пачобут. За гады кіравання Саўчанкі ў Гродне была ліквідаваная незалежная прэса — газеты «Пагоня» і «Біржа інфармацыі», — руйнаваўся гістарычны цэнтр, адбываўся наступ на Саюз палякаў. Журналіст прыгадвае таксама гучную адстаўку начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама Генадзя Хацько, якога знялі з пасады згодна з указам Лукашэнкі ад 3 лістапада 2009 года з фармулёўкай «у сувязі з здзяйсненнем праступкаў, што дыскрэдытуюць званне супрацоўніка органаў унутраных спраў». «Саўчанка сябраваў з Хацько і, па чутках, да апошняга бараніў яго», — кажа Пачобут.



Мікола Маркевіч, рэдактар зачыненай уладамі газеты «Пагоня», кажа, што з адстаўкай Уладзіміра Саўчанкі яго родны горад атрымаў шанец. «Лічу яго вялікім непрафесіяналам, які за час свайго кіравання нанёс велізарную шкоду гораду. Яго сыход расцэньваю як шанец на з'яўленне адэкватнага і разумнага кіраўніка».

У падрыхтоўцы тэракта супраць Саўчанкі абвінавачваецца зняволены ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч.

**Сямён Печанко**

**Уладзімір Саўчанка**

нар. 26 лютага 1952 г. у в. Фролаўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Беларускую дзяржаўную сельгасакадэмію па спецыяльнасці інжынер землеўпарадкавання. Кар'еру пачынаў у адным з калгасаў Круглянскага раёна, затым працаваў старшынёй Круглянскага райвыканкама і намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама. У сакавіку 2001 заняў пасаду старшыні аблвыканкама пасля смерці Аляксандра Дубка. На пасадзе кіраўніка аблвыканкама меў вымову за затрымкі заробкаў і фальсіфікацыю справаздачных звестак па гэтых пытаннях.

## Не вытрымала

**Жонка ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча Алена з'ехала з краіны. Следства патрабавала ад жанчыны даць паказанні супраць мужа.**

Яна, натуральна, адмаўлялася. Цяпер на тэлефонныя званкі спн. Алена не адказвае.

Арышт Мікалая цяжка адбіўся на здароўі ягонай жонкі. Яна перажыла нервовы зрыў, пасля якога доўга лячылася. Урэшце жанчына не вытрымала.

Адзіная дачка Аўтуховіча Кацярына жыве ў Польшчы. Яна вучыцца на факультэце кіравання Варшаўскага ўніверсітэта.

Мікалай Аўтуховіч ад 8 лютага 2009 года знаходзіцца за кратамі. Ён абвінавачваецца ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта супраць тагачаснага старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі і намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянка. Дата пачатку судовага працэсу яшчэ не прызначаная.

**ЗП**

## Сцісла

### Халады адпускаюць

28 і 29 студзеня па краіне чакаецца воблачнае надвор'е. Месцамі снег, завіруха. Тэмпература ноччу па паўночна-ўсходніх раёнах да мінус 24°C, днём мінус 6—13°C, па паўночным усходзе да мінус 15°C. У Мінску 28 студзеня — завіруха, галалёдзіца. Тэмпература паветра днём мінус 9—11°C. 29 студзеня пад уплывам паўднёвага ветру маразы яшчэ трохі адступяць. Тэмпература паветра ноччу мінус 6—13°C, днём мінус 4—11°C.

### Даляр ідзе на рэкорд

Даляр паўтарыў рэкорд, усталяваны ў ліпені мінулага года. Курс, аб'яўлены Нацбанкам на 27 студзеня, складае 2882 рублі. У абменніках амерыканскія грошы прадаюцца даражэй за 2900 рублёў.

### Злодзеі распілавалі банкамат

З банкамата «БПС-Банка» ў Заводскім раёне Мінска ўначы 25 студзеня было выкрадзена 202 млн рублёў. Зламыснікі распілавалі тыльную частку дзверцаў банкамата. Распачатая крымінальная справа.

### Беларусы трапілі ў ДТЗ у Егіпце

У Егіпце на трасе Заафарана — Каір трапіў у ДТЗ аўтобус, які перавозіў турыстаў з Беларусі, якія адпачывалі на Чырвоным моры, на курорце Раас Гарыб. З прычыны кепскага надвор'я і перавышэння хуткасці кіроўцам аўтобус з'ехаў у кювет. Тры турысты атрымалі лёгкія цялесныя пашкоджанні.

**ЯМ, паводле RBC, БелаПАН, газета.ру**

# Алесь Язвінскі: Патомны настаўнік з Нясвіжа

Яго дзед скончыў у пачатку XX ст. Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, каля сарака гадоў настаўнічаў. Унук мае ўсе шанцы дагнаць продка — ён распачаў чацвёрты дзясятак гадоў на нялёгкай школьнай ніве.

«Я сам скончыў гэтую школу, больш за трыццаць гадоў выкладаю ў ёй. Унукі маіх колішніх вучняў хутка пойдуць вучыцца», — расказвае настаўнік фізкультуры Нясвіжскай школы №3 Алесь Язвінскі. 15 студзеня яго разам з пяццю настаўнікамі Міншчыны, сябрамі апазіцыйных партый, выклікала загадчыца ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Таіса Данілевіч, каб выставіць ультыматум: або праца, або партыя. Алесь Язвінскі абраў трэці шлях — звярнуўся ў пракуратуру.

### Настаўнік патанае ў паперах

У Нясвіж Алесь Язвінскі перабраўся з бацькамі з Пухавіцкага раёна ў пачатку 1970-х. Давучыўся ў старэйшых класах школы №3, паступіў у інстытут, а ў 1979-м вярнуўся сюды настаўнікам фізвыхавання. «За тры дзесяцігоддзі выкладання ў школе ў арганізацыйным плане сёння найгоршая для працы сітуацыя. Такога нават за Брэжневым не было, — кажа ён. — Настаўнікі проста патанаюць у паперах. Мы ператвараемся ў робатаў, якія ўвесь час рыхтуюць справаздачы, амаль не маючы часу на асноўную дзейнасць — навучанне дзяцей. Праз гэта шмат хто кідае настаўніцтва ды сыходзіць на вольны хлеб. З нашай школы ўжо сышлі настаўнікі спеваў і музыкі і малявання, якім скарацілі гадзіны».

Працяг на старонцы 8.


# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 6000 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014
Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


## Дзякуй падпісчыкам

Дзмітрыю К. з Рагачоўскага раёна.
Віталю Г. з Чачэрскага раёна.
Барысу Я. з Нясвіжскага раёна.
Івану Л., А.Э. з Пружанскага раёна.
Аляксандру С. з Кіраўскага раёна.
Івану Л. з Вілейскага раёна.
Мікалаю Р. з Навагрудскага раёна.
Лявонцію А., Мікалаю Ч., Стэфану Н., Руслану К. з Полацкага раёна.
К.С. з Горацкага раёна.
В.К., Аляксандру Р., Сцяпану Г., Уладзіміру К. з Мінскага раёна.
Андрэю М. з Чашніцкага раёна.
А.Г., Але Г. з Бабруйскага раёна.
Н.Ш., Юрыю Г., Т.В., Івану Р., Н.Б., А.П., Артуру Б., Г.К. з Гродна.
Ніне А. з Клімавіцкага раёна.

# Змагары са шкодным кірункам думак пайшлі на павышэнне

**Лукашэнка простаператасаваў старую калоду кадэбістаў.**

У кіраўніцтве Камітэта дзяржаўнай бяспекі прайшлі кадравыя перастаноўкі. На ключавыя пасады прызначана ажно дзесяць чалавек. Старшыня Вадзім Зайцаў сваё месца захаваў.

Не трэба пераацэньваць значнасць новых прызначэнняў. Лукашэнка простаператасаваў старую калоду кадэбістаў. Змены носяць касметычны характар.

Берасцеец Леанід Дзядкоў стаў намеснікам старшыні кіраўніка КДБ. Дзядкоў заслужыў славу тым, што будучы на пасадзе кіраўніка берасцейскага КДБ ініцыяваў судовы працэс супраць часопіса ARCHE, звінаваціўшы 1100-старонкавы юбілейны нумар выдання ў экстрэмізме. Асобнік часопіса быў выпадкова канфіскаваны на мытні.

Таксама вядомасць Дзядкову прынесла фраза ягонага намесніка, што «са шкодным кірункам думак у шырокім сэнсе слова ў нас змагаюцца ўсе без выключэння аператыўныя падраздзяленні на замацаваных за імі напрамках работы». Фраза была прамоўлена ў часе супольнай з Дзядковым прэс-канферэнцыі. Так вось Дзядкоў заслужыў павышэнне.

Намеснікам Вадзіма Зайцава па кадравым забеспячэнні і арганізацыйнай працы стане Ігар Бахматаў, які да гэтага быў начальнікам Інстытута нацыянальнай бяспекі. А яшчэ перад гэтым працаваў кіраўніком Брэсцкага КДБ, дзе яго замяніў той самы Дзядкоў.

На добрую для кар’ернага росту пасаду кіраўніка Брэсцкага абласнога КДБ прызначаны Ігар Бусько. Ён быў кіраўніком галоўнага ўпраўлення контрвыведкі КДБ. Але гэтае месца таксама не засталося пустым. Бусько там змяніў Сяргей Шугаеў.

Берасцейцы аказаліся самымі папулярнымі сярод новых прызначэнцаў. Былы намеснік Дзядкова па Брэсцкай вобласці Іван Ляскоўскі стаў галоўным ужо ў вобласці Гомельскай.



**На новым месцы Леанід Дзядкоў заслужыць яшчэ адзін медаль.**

Прыйшоў Ляскоўскі ў Гомель на месца Івана Каржа, але самога Каржа таксама ніхто не спісаў, яго перасунулі на працу ў Гродна, кіраўніком абласнога КДБ.

Былы ж галоўны кадэбіст Гродзенскай вобласці Ігар Сергіенка збірае чамаданы ў вобласць Магілёўскую. Цяпер ён кіраваць будзе тамтэйшым КДБ. Напэўна, гэта робіцца, каб чалавек не заседжваўся доўга на адным месцы.

Начальнікам управы КДБ па горадзе Мінску і Мінскай вобласці прызначаны пакуль невядомы Уладзімір Калач. Ён замяніў на пасадзе Ігара Кузняцова, які ў свой час асабіста займаўся крымінальнымі справамі супраць «маладафронтаўцаў». Кузняцоў жа стаў начальнікам Інстытута нацыянальнай бяспекі, замест Бахматава, які пайшоў на павышэнне.

Начальнікам галоўнай управы ўрадавай сувязі КДБ стаў Віктар Ярута. Ён, як і Вадзім Зайцаў, прыйшоў у Камітэт з памежнікаў.

Падпалкоўнік запасу КДБ Валеры Костка кажа, што змены могуць быць звязаныя з хуткімі выбарамі. «Пасля адстаўкі Мацкевіча КДБ фактычна ператвараецца з сур’ёзнай спецслужбы ў асабістую ахранку прэзідэнта. Туды ідуць служыць хто заўгодна: пагранічнікі, танкісты, падаткавікі, але не прафесійныя чэкісты», — кажа Валеры Костка.

Падпалкоўнік узгадвае, што ў свой час сённяшні кіраўнік КДБ Вадзім Зайцаў прывёў з памежнага камітэта ў КДБ аж 40 чалавек. «Цяпер працягваецца гэтая праца па стварэнні ручнога органа», — дадае В.Костка.

**Зміцер Панкавец**

# «Ізвініце, што пераходжу на ваш язык»

**У Першамайскім раённым судзе сталіцы прайшоў разгляд грамадзянскай справы сустаршынь партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя Паўла Севярынца і Віталя Рымашэўскага супраць Белтэлерадыёкампаніі і журналіста Андрэя Крывашэева.**

27 верасня ў вечаровым эфіры «Панарамы тыдня» на БТ выйшаў рэпартаж Андрэя Крывашэева, прысвечаны дзейнасці БХД. Заснавальнікі партыі знайшлі дастаткова шмат падставаў, каб звярнуцца ў суд з просьбай абароны гонару і годнасці, а таксама дзелавой рэпутацыі. Пазоўнікі запатрабавалі абвяржэння дадзенай інфармацыі ў той самы час, калі быў паказаны рэпартаж. А таксама спагнаць з тэлеканала і сп.Крывашэева па 50 мільёнаў рублёў.

**Севярынец (на фота)** зазначыў, што пусціць гэтыя грошы на перайменаванне вуліц у родным Віцебску. «У сувязі з інфляцыяй суму можна нават павялічыць», — зазначыў В.Рымашэўскі.

Працэс вяла суддзя Вольга Багам’я. Сам Крывашэеў на суд не з’явіўся, яго інтарэсы абаранялі прадстаўнікі юрыдычнага аддзела тэлеканала.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Частка людзей на працэс спазнілася. Суддзя Багам’я на гэта сказала: «Зала была спецыяльна адкрытая раней, каб вы маглі сесці, дзе вам зручней». Адказ з залы: «Дзеці не навучаныя яшчэ — мала судзілі».

Севярынец сказаў, што паводле гэтага рэпартажу ён паўстае нейкім «параджэннем пекла».

Сярод іншага ягонае абурэнне выклікалі фразы, што подпісы збіраюцца шляхам падману і махінацый. Саміх сяброў БХД называлі «псеўдапратэстантамі», расказвалі пра «падпольную царкву, якая забараняе прыхаджанам сустракацца з прадстаўнікамі не сваёй царквы». Таксама ў рэпартажы гаварылася, што БХД настойвае на наданні звання герояў «двум дэзерцірам-эсэсаўцам». Ну і, апроч усяго, БХД «небяспечная для здароўя».

Павел Севярынец адразу зазначыў, што не верыць у справядлівы вынік суда.

Контраргументы прадстаўнікоў БТ былі наступнымі. Паколькі няма такой юрыдычнай асобы як БХД, то і справы адпаведна быць не можа. Матэрыял быў не канкрэтна пра Севярынца ці Рымашэўскага, а пра ўсё партыю.

На пытанне Севярынца, а чаму на экране тады ўвесь час з’яўляўся ягоны твар, быў наступны адказ: «Дык там жа нідзе не падпісана, што гэта ваша ліцо».

Прадстаўніца тэлеканала Вольга Дуброўская заявіла, што ніякай прывязкі паміж тэкстам і карцінкай няма. На пытанні пазоўнікаў жанчына адказвала з некаторымі беларускімі словамі, а потым дадала: «Ізвініце, што пераходжу на ваш язык».

Дзесьці а 17-й суддзя Вольга Багам'я адхіліла пазоў Севярынца і Рымашэўскага да БТ. Ніякіх тлумачэнняў прычынаў адмовы зачытана не было.

**ЗП**

# Новая латарэя Дзмітрыя Лукашэнкі

**У нядзелю 24 студзеня на БТ стартавала новая латарэя — «КЕНО». Яе распачынае кампанія «Спорт–пары», якая ўжо мае «Спортлато 5 з 36».**



GAZETABY.COM

Заснавальнікамі Закрытага акцыянернага таварыства «Спорт-пары» восенню 2008 года сталі ПУП «СЕН-КО», беларуска-англійскае прадпрыемства «Дзелавая сець», а таксама Прэзідэнцкі спартовы клуб. Апошні ўзначальвае сярэдні сын Лукашэнкі — **Дзмітрый (на фота)**.

Менавіта прэзідэнцкаму клубу належаць дзве трацiны статутнага фонду кампаніі.

У Беларусі існуе некалькі латарэйных кампаній: «Беларускія латарэі» (праводзіць перадачу «Ваша лато»), «Беларуская спартыўная латарэя» («Суперлато»).

Усе гэтыя прадпрыемствы блізкія да дзяржавы. Латарэйны бізнэс прыносіць немалыя прыбыткі. Вось і атрымліваецца, што сфера латарэй у Беларусі практычна цалкам манапалізаваная ўладамі.

**ЗП**

# Алесь Каліта-дэмбель: У войску пабачыў, хто мне сябар, а хто — не

**23 студзеня дэмбелю дачакаўся былы лідэр «Моладзі БНФ» Алесь Каліта. Ён служыў у 29–й зенітна–ракетнай брыгадзе ў вёсцы Межыца Лепельскага раёна.**



**«НН»: З якімі пачуццямі вяртаешся?**

**АК:** Галоўная выснова — гэты час не прайшоў дарма. Тут добра пабачыў, хто быў мне сапраўдным сябрам, а хто — не. Удзячны сваім камандзірам, якія прыслухоўваліся да маіх меркаванняў.

**«НН»: У войску ты адчуваў сябе досыць камфортна?**

**АК:** У цывільным жыцці я не надта распешчаны. Ад 16 гадоў фактычна пачаў жыць самастойна, было рознае. Можа таму вайсковыя моманты не адчуваў так рэзка. У часці мне было нармальна.

**«НН»: А што войска дало?**

**АК:** Стаў больш дысцыплінаваным. Пачаў лепш адрозніваць мяжу паміж галоўным і другасным.

**«НН»: Якія цяпер планы?**

**АК:** У любым выпадку застануся ў палітыцы. Для мяне гэта важна, пакуль сядзіць мой сябар Арцём Дубскі. Буду працаваць на партыю. Не ведаю толькі, ці буду публічнай асобай. Мне больш падабаюцца арганізатарскія моманты. Добрых арганізатараў у нас мала.

**Гутарыў ЗП**




PHOTO.BYMEDIA.NET

# Апякліся на малацэ

**У дзясятцы самых стратных адкрытых акцыянерных таварыстваў Беларусі дзевяць пазіцый займаюць малочныя, масла– і сыраробчыя камбінаты.**

Міністэрства фінансаў развеяла ілюзіі аб прыбытковасці малочнай прамысловасці. Апублікаваная ведамствам справаздача аб працы адкрытых акцыянерных таварыстваў у студзені-верасні 2009 г. дае поўную карціну аб моцных і слабых баках беларускай вытворчасці.

### Напаўняльнікі бюджэту

У ліку самых прыбытковых ААТ засталіся нафтаперапрацоўшчыкі, хоць іх даходы і скараціліся ў некалькі разоў. У параўнанні са студзенем-вераснем 2008 г. прыбыткі навапалацкага «Нафтана» ў далярах скараціліся ў 3,5 разу. Інфармацыя пра некаторыя прадпрыемствы не распаўсюджваецца. У «закрыты» спіс трапілі Мазырскі НПЗ, наваполацкі «Палімір», «Белтрансгаз».

Мінскі аўтамабільны завод быў акцыянаваны ў 2008 г., таму з'явіўся ў спісе ўпершыню. Справаздача адразу ж засведчыла поспех ў памеры $29,6 млн прыбытку.

Хімічная прамысловасць не здае пазіцыі. Гомельскі хімзавод прадэманстраваў самы вялікі рост прыбытку — у сем разоў.

З гразі ў князі — так можна ахарактарызаваць дзейнасць «Мотавела». За дзевяць месяцаў 2009 года прыбытак завода склаў $10 млн. Прычым летась завод «напрацаваў» амаль на такі самы мінус.

З харчовай прамысловасці лепш за ўсё паказалі сябе агракамбінат «Дзяржынскі» і Слуцкі цукрарафінадны завод. Мяркуючы па тым, што сусветныя цэны на цукар б'юць усе рэкорды, перспектывы слуцкага завода выглядаюць прывабна і налета.

Паспяхова працавалі некаторыя прыватныя піўныя кампаніі, якія здолелі істотна павялічыць прыбытак. «Лідскае піва» зарабіла $7,8 млн, а «Аліварыя» — $4,5 млн.

### Прамысловы баласт

Насуперак меркаванню пра поспехі беларускай малочнай прамысловасці, для яе статыстыка выглядае несуцяшальна. Дзевяць прадпрыемстваў малочна-масла-сыраробчага профілю агулам напрацавалі ў мінус ажно на $67 мільёнаў! Прычым летась страты кожнага з іх не пераходзілі мяжу ў два мільёны даляраў. Цяпер Лідскі малочна-кансервавы завод дакаціўся да мінус $11 мільёнаў...

Гродзенскі «Азот», хоць і мае станоўчы баланс, але можа быць прыпісаны да няўдачнікаў. Прадпрыемства атрымала прыбытку ў 13 разоў меней — з $87 млн у 2008 г. да $6,6 млн у 2009-м.

Сярод кампаній, якія маюць па пяць мільёнаў даляраў і больш стратаў, спрэс «харчавікі». Апроч іх, усяго два іншыя акцыянерныя таварыствы — «Гомельшкло» і «Гарызонт». Тэлевізары і іншая бытавая тэхніка прынесла заводу мінус $5 млн за дзевяць месяцаў, як і летась, а вось шкляры трапілі ў адмоўны рэйтынг упершыню.

**Ягор Марціновіч**

**ТОП-10 самых прыбытковых ААТ (у дужках — дадзеныя 2008 г.), $ млн**

| | |
|---|---|
| 1. «Нафтан» | 45,2* (168*) |
| 2. МАЗ | 29,6 (у 2008 звестак не было) |
| 3. «Брэстгазаапарат» | 27,6 (15,4) |
| 4. Гомельскі хімічны завод | 22 (3,3) |
| 5. МАПІД | 21,9 (27,4) |
| 6. «Гроднажылбуд» | 18,2 (16,8) |
| 7. «Агракамбінат «Дзяржынскі» | 17,2 (17,1) |
| 8. «Гроднахімвалакно» | 14,2 (17,3) |
| 9. Слуцкі цукрарафінадны завод | 13,9 (12,4) |
| 10. «Краснасельскбудматэрыялы» | 11 (49,7) |

*у 2008 годзе сума вылічвалася па курсе $1=2200 рублёў, а ў 2009 годзе — $1=2800 рублёў

**ТОП-10 самых стратных ААТ (у дужках дадзеныя 2008 г.), $ млн**

| | |
|---|---|
| 1. Лідскі малочна–кансервавы завод | −11* (−1,6*) |
| 2. Аршанскі малочны камбінат | −7,8 (−1,9) |
| 3. Слуцкі сыраробчы камбінат | −7,3 (0,2) |
| 4. Навагрудскі масларобчы камбінат | −7,2 (−2) |
| 5. «Гомельшкло» | −7,2 (3,5) |
| 6. «Клецкая крыначка» | −7,1 (−1,6) |
| 7. Маладзечанскі малочны камбінат | −6,9 (−0,1) |
| 8. «Малако» г. Віцебск | −6 (−1,2) |
| 9. «Быхаўмалако» | −6 (0,1) |
| 10. «Смаргонскія малочныя прадукты» | −5,9 (−1,4) |

*у 2008 годзе сума вылічвалася па курсе $1=2200 рублёў, а ў 2009 годзе — $1=2800 рублёў

## Расіянам дадуць грошы на пакупку новых машын

**Ад 8 сакавіка ў Расіі людзі змогуць здаць на ўтылізацыю стары аўтамабіль і атрымаць $1,5 тысячы на пакупку новага.**

Урад Расіі не хавае, што ідзе ўслед за Германіяй, якая летась прапанўвала сваім грамадзянам па 2,5 тысячы еўра на тыя ж мэты. Там праграмай скарысталіся два мільёны чалавек. Ідэю падхапілі Францыя, Італія, Іспанія і ЗША. Схема простая: здаеш старую машыну і выбіраеш новае аўто айчыннай вытворчасці з прапанаванага ўрадам спіса. Дзяржава даплачвае аўтацэнтру пэўную частку грошай.

У Расіі праграма запрацуе ад 8 сакавіка і працягнецца да 1 лістапада 2010 г. Праўда, мяркуючы па досведзе іншых краінаў, выдзеленыя грошы расхапаюць раней. Прымаюцца машыны на хаду, якім дзесяць гадоў і больш. Узамен дазволяць купіць ВАЗ, ГАЗ, а таксама «Форд», «Таёту», «Фальксваген» расійскай зборкі.

Якая выгада дзяржаве? Па-першае, удасца павялічыць унутранае спажыванне і кампенсаваць слабы экспарт. Па-другое, узрасце загрузка заводаў і рабочых не прыйдзецца звальняць.

**ЯМ**

| | Беларусь | Расія | Украіна | Польшча | Літва |
|---|---|---|---|---|---|
| АІ-92 | 2520 | 2051 | 2534 | 4186 | 4309 |
| АІ-95 | 2840 | 2254 | 2745 | 4434 | 4473 |
| Дызель | 2270 | 1768 | 2340 | 3700 | 3548 |

## Бензін падаражэў

Ад 23 студзеня канцэрн «Белнафтахім» павялічыў унутраныя цэны на нафтапрадукты на 2%. Падаражанне тлумачаць сітуацыяй на сусветным нафтавым рынку. У папярэдні раз бензін даражэў у верасні 2009 года, а з таго часу цана нафты павялічылася на 15%.

Тым не менш, у параўнанні з суседзямі беларускія цэны выглядаюць прывабна. Танней толькі ў Расіі. Прыкладна на такім самым узроўні трымаюцца цэны ва Украіне. А вось у Польшчы і Літве аўтамабілісты плацяць нашмат больш.

**ЯМ**

## Бітва за надзелы

**Улады спыняюць фіктыўную рэгістрацыю ў Мінскім раёне дзеля атрымання надзелаў.**

Дзяржава вырашыла змагацца з фіктыўнай рэгістрацыяй грамадзянаў у Мінскім раёне. Людзі масава рэгіструюцца ў прэстыжнай мясцовасці, каб стаць у чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў і атрымаць зямельныя надзелы. Пры гэтым будуецца толькі кожны шосты. Большасць атрымлівае надзел для далейшага перапродажу. У лютым уступае ў моц заканадаўчы акт, згодна з якім людзям будзе неабходна чакаць пяць гадоў пасля таго, як яны набудуць статус маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Збяднелі за год на 0,4%

Рэальныя налічаны заробак з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў Беларусі ў параўнанні з 2008 годам зменшыўся на 0,4%.

Сярэднямесячны заробак у Беларусі ў 2009 годзе склаў 998,3 тысячы рублёў. Найбольш зараблялі навукоўцы (1787 тысяч рублёў), найменш — работнікі сацзабеспячэння — 640 тысяч рублёў.

### Расія ўзмацніла кантроль на мяжы

Колькасць супрацоўнікаў расійскіх мытных органаў на мяжы з Беларуссю значна павялічана. Напрыклад, на Смаленскай мытні — прыкладна на 120 чалавек.

### Дарога да АЭС

Сёлета пачнецца будаўніцтва пад'язных дарог да будучай АЭС. Гэтая задача — адна з галоўных у «Белаўтадора» на 2010 год.

Таксама створаць аўтадарожны абход Белавежскай пушчы.

### Абсалютна несвабодныя

У рэйтынгу эканамічнай свабоды амерыканскага інстытута The Heritage Foundation Беларусь трапіла ў групу «абсалютна несвабодных» краін. У штогадовым дакладзе Беларусь заняла 150-е месца са 183. Эксперты зазначаюць, што ў краіне існуе «паўсюдны кантроль і ўмяшанне дзяржавы ў беларускую эканоміку».

У тройцы найлепшых апынуліся Ганконг, Сінгапур і Аўстралія.

**ЯМ**

# Глабальнае памутненне, а не глабальнае пацяпленне

Піша **Алесь Чайчыц**.

*Scio me nescire*[1]
***Сакрат***

Паціху ападае пыл баталій вакол снежаньскай Канферэнцыі ААН па змене клімату. Сціхаюць жарсці, і нам з'яўляецца магчымасць хоць трохі прааналізаваць, што ж застаецца ў выніку. Тым болей, што тэма змены клімату была і застаецца адной з найбольш актуальных у свеце і будзе яшчэ доўга ўплываць на глабальны парадак дня.

Сучасная нават не кампанія, а цэлая глабальная «мода» на барацьбу са зменамі клімату, агучаная навукоўцамі, агалошаная палітыкамі і падтрыманая тысячамі актывістаў на месцах, палягае ў наступных сцверджаннях:

1. Адбываецца глабальнае пацяпленне клімату, якое а) адхіляецца ад натуральнай нормы тэмпературных ваганняў і б) уяўляе сабой небяспеку для чалавецтва. Дзеля справядлівасці варта адзначыць, што да 1980-х гадоў навукоўцы-кліматолагі палохалі чалавецтва глабальным... пахаладаннем, цяпер галоўным чынам гаворыцца пра глабальнае пацяпленне, але зважаючы на выпадкі, калі Еўропа ўзімку час ад часу вымушана сутыкацца з марозам і снегападамі, ужываецца гнуткая фармулёўка «climate change», «змена клімату».

2. Чалавецтва спрычынілася да гэтага змянення клімату — у прыватнасці, цераз празмерную эмісію парніковых газаў, у першую чаргу вуглякіслага газу $CO_2$.

3. Чалавецтва ў стане паспяхова супрацьстаяць змене клімату, у прыватнасці, праз змяншэнне эмісіі $CO_2$.

Зняпраўджанне любога з гэтых тэзісаў пазбаўляе сэнсу ўсю патэтычную і напоўненую драматызмам барацьбу з глабальным пацяпленнем (ці з чым там).

Праблема ў тым, што ўся гісторыя з імавернай барацьбой супраць змены клімату грунтуецца на сцверджаннях, якія складана ці немагчыма даказаць. І прыхільнікі, і скептыкі аперуюць табліцамі, статыстычнымі дадзенымі, дадзенымі навуковых назіранняў. Асабліва эфемерны «навуковы кансенсус», які ў якасці галоўнага козыра прад'яўляюць апалагеты барацьбы супраць змены клімату. Які можа быць навуковы кансенсус, калі ёсць сур'ёзныя навукоўцы, што скептычна ставяцца да тэорыі антрапагеннага пацяплення?

Між тым, размова ідзе пра мільярды долараў і глабальнае рэгуляванне эканомікі. Адпавядае яна рэчаіснасці ці не — тэорыя антрапаморфнай змены клімату ўжо зрабілася істотным фактарам фармавання міжнароднай палітыкі, ігнараваць які нават расійскае кіраўніцтва, enfant terrible сусветнай супольнасці, наважаецца толькі вельмі асцярожна. Стаўкі зробленыя, гульня ідзе. Як інвестбанкіры да фінансавага крызісу хутка «забывалі» пра тое, што ў аснове мудрагелістых прыбытковых фінансавых схемаў ляжалі сумнеўныя актывы, так і глабальны палітычны клас цяпер пабудаваў на аспрэчанай тэорыі вялікія праекты па павелічэнні ўласных паўнамоцтваў і пераразмеркаванні фінансаў. Нават Папа Бенедыкт XVI у сваім звароце да сусветнага дня міра (1 студзеня) сярод экалагічных пагрозаў першаю назваў менавіта глабальнае пацяпленне.

Ніхто з нас не праводзіў уласнымі рукамі назіранні тэмпературы і не вывучаў уласнаручна гістарычныя крыніцы на прадмет ускосных сведчанняў пра цыклічнасць пацяпленняў. Чалавек з вуліцы бачыць толькі тое, што апошнія пару гадоў мелі дождж на Новы год альбо халоднае лета — што можа быць растлумачанае як анамальным глабальным пацяпленнем (якое нібыта можа быць выкліканае дзейнасцю чалавецтва), так і цыклічнымі тэмпературнымі флюктуацыямі і сонечнай актыўнасцю ў рамках нормы.



**Рэкордна халодны студзень адвучыць вадаплаўных птушак ад зімовак у Беларусі.**

Скандал з уцечкай электроннай перапіскі кліматолагаў універсітэта Усходняй Англіі (дзе размова вялася пра фальсіфікацыю дадзеных даследаванняў дзеля пацверджання тэзіса аб антрапагенным глабальным пацяпленні) прадэманстраваў, што навукоўцы, якія гэтымі пытаннямі нібыта займаюцца, тэарэтычна ў стане падсунуць грамадскасці што заўгодна. Грамадскасць не будзе ў стане ацаніць праўдзівасць ці непраўдзівасць іхніх тэзісаў.

У сувязі з гэтым для шараговага чалавека пазіцыя датычна глабальнага пацяплення з'яўляецца прадметам веры, а не чымсьці даказаным. І як абаронцы любой веры, абаронцы тэорыі антрапагеннага пацяплення ледзь не з кулакамі кідаюцца на тых, хто смее сумнявацца ў правільнасці іхніх догмаў. «Навукоўцам, напэўна, відней». Падобнае падчас пары назіраецца і з боку іх працінікаў.

Мы дакладна ведаем пра шкоду ад тонаў неперапрацаванага смецця, ад забруджвання вады, паветра і глебы. Беларусь на ўласным досведзе ведае пра шкоду радыяцыйнага забруджвання. Усё гэта канкрэтныя, вельмі дакладна вядомыя беды. На барацьбе менавіта з гэтымі з'явамі зацікаўленыя людзі павінны сканцэнтраваць сваю экаактыўнасць.

Дыскусія ж пра змену клімату — гэта дыскусія вакол віртуальнага. Ніхто не можа гарантаваць, што праз дзесяць гадоў «навуковы кансенсус» у чарговы раз не пераменіцца з пацяплення на пахаладанне. Але выдзеленыя на даследаванне пацяплення грошы і палітычны капітал на людскім страху на той момант будуць ужо, што завецца, «асвоеныя».

**Алесь Чайчыц**

нар. у 1984. Фінансавы аналітык беларускага паходжання. Працуе ў Лондане, піша па-беларуску.

[1] Я ведаю, што нічога не ведаю (лац.)

# Дзесяць гадоў як беларускамоўныя

**У 2000 годзе школы, міліцыя і войска мусілі цалкам перайсці на беларускую мову. «Закон аб мовах у Беларускай ССР», прыняты Вярхоўным Саветам БССР 26 студзеня 1990 года, адводзіў на беларусізацыю дзяржаўных устаноў 10 гадоў.**

«Мова — не толькі сродак зносін, а і душа народа, аснова і найважнейшая частка яго культуры. Жыве мова — жыве народ. Кожная мова, яе літаратурная, жывая мясцовая і гістарычная разнавіднасць — неацэнны скарб, які належыць не аднаму народу, а ўсяму чалавецтву. Гонар і абавязак усіх — шанаваць родную мову, судзейнічаць яе развіццю і росквіту, паважліва ставіцца да моў іншых народаў». Гэтымі словамі пачынаецца «Закон аб мовах у Беларускай ССР».

Закон, які прадугледжваў наданне беларускай мове статуса адзінай дзяржаўнай, быў прыняты 26 студзеня 1990 года Вярхоўным Саветам БССР XI склікання — пераканаўчай большасцю галасоў. Вось як у сваіх успамінах узгадвае поўныя радаснага хвалявання першыя хвіліны пасля галасавання Ніл Гілевіч, ён быў кіраўніком працоўнай групы па падрыхтоўцы праекта Закона: «Калі на табло загарэліся выніковыя лічбы — воплескі ў зале прагучалі грымотныя. Старшыня Вярхоўнага Савета тут жа абвясціў на 15 хвілінаў перапынак,— думаю, наўмысна, каб даць людзям абмяняцца пачуццём радасці. І дэпутаты гэтай радасці не хавалі, і горача віншавалі адзін аднаго з перамогай. Збылося! Сталася! Здзейснілася! Беларуская мова ў Беларусі ад гэтага часу — дзяржаўная! Многія ад радасці рашылі і скончыць на гэтым свой сённяшні рабочы дзень. Незвычайны, сапраўды гістарычны дзень! Тое, з-за чаго столькі перажывалі, хваляваліся, трымцелі душою,— адбылося. Закон прыняты! Усё! Назад ужо цяпер не адкруціш!» (Запомнім, чытач, гэтыя словы, гэтыя наіўныя словы.)

Пазней на аснове Закона аб мовах была складзена Дзяржаўная Праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларусі. Камісію па стварэнні праграмы ўзначальвала Ніна Мазай. 28 верасня 1990 г. праект праграмы зацвердзіў Савет міністраў, і яна пачала ажыццяўляцца на ўсіх узроўнях. Закон прадугледжваў паступовы пераход да ўжывання беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага і палітычнага жыцця. Да канца 2000 года па-беларуску мусілі запрацаваць установы адукацыі, праваахоўныя органы, войска і г.д. Аднак ганебны рэферэндум 1995 года перакрэсліў гэтыя планы, вярнуўшы расійскай мове статус дзяржаўнай. Выжыванне і развіццё беларускай мовы стала клопатам незалежнага грамадства.

**Сямён Печанко**

**Таварыства беларускай мовы патрабуе роўнасці**

Рада ТБМ звярнулася да кіраўніцтва краіны з патрабаваннем адмяніць унясенья ў «Закон аб мовах» у 1998 г. папраўкі, якія далі пачатак татальнай русіфікацыі. Таварыства прапануе выдаць указ прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб пашырэнні сферы ўжывання дзяржаўнай беларускай мовы», у якім варта прадугледзець наступныя мерапрыемствы:

1. Павялічыць колькасць гадзін беларускай мовы і літаратуры ў школах.

2. Аднавіць у ВНУ курс «Беларусазнаўства» на беларускай мове.

3. Вярнуць ва ўсе школы краіны выкладанне курсаў гісторыі і геаграфіі Беларусі па-беларуску.

4. Адкрыць да 1 верасня 2010 г. у кожным абласным і раённым цэнтры Беларусі па адной беларускамоўнай школе ці гімназіі.

5. Зрабіць даплаты ў памеры 20% заробку выкладчыкам ВНУ, якія выкладаюць свае прадметы па-беларуску.

6. Зрабіць абавязковым школьны экзамен па беларускай літаратуры.

# «Залаты адвакат» пад следствам

**Суд над вядомым адвакатам абяцае скандалы і выкрыцці.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

У судзе Партызанскага раёна Мінска пачаліся слуханні крымінальнай справы адваката Канстанціна Бялова, які на працягу многіх гадоў абслугоўваў VIP-персон беларускай сталіцы.

Канстанцін Бялоў — адзін з самых вядомых адвакатаў Мінска, паслугамі якога карысталіся вельмі заможныя і ўплывовыя людзі. Менавіта ён у 2006 годзе абараняў Алега Бадалава — дырэктара гімназіі №16, дзе вучыцца ўнучка Лукашэнкі і дзеці іншых уплывовых персон Беларусі. Сярод кліентаў Канстанціна Бялова быў у свой час і дырэктар трэста «Прамбуд» Уладзімір Мазаўко, які будаваў Дразды, а таксама элітны пасёлак каля Кургана Славы для кіраўнікоў краіны.

Гісторыя абароны яшчэ аднаго такога VIP-кліента і стала для Канстанціна Бялова фатальнай. Гаворка ідзе пра гаспадара і дырэктара ТАА «Белінтэркул».

Гэта кампанія была раней найбуйнейшым пастаўшчыком у Беларусь сістэм вентыляцыі і кандыцыянавання.

«Белінтэркул» усталёўваў сістэмы кандыцыянавання для рэзідэнцыі Лукашэнкі, Нацбанка, МУС. У 2007 годзе дырэктара кампаніі абвінавацілі ва ўчыненні дзяржаўным арганізацыям асабліва буйной шкоды. Быццам бы кампанія пастаўляла сістэмы вентыляцыі і кандыцыянавання па завышаных цэнах. Шкода ацэньвалася ў суму каля мільёна даляраў.

Дырэктара арыштавалі, а потым хутка выпусцілі пад залог, каб кампанія скончыла ўсталяванне сістэм кандыцыянавання ў рэзідэнцыі кіраўніка дзяржавы і пачала кампенсаваць шкоду.

На працягу двух гадоў расследаванне справы ішло пусці-павалюся. Дырэктар здолеў амаль цалкам пагасіць урон і пачаў з дапамогай адваката Канстанціна Бялова рыхтаваць прашэнне аб памілаванні на імя Лукашэнкі.

Аднак расследаванне перадалі ў Галоўнае следчае ўпраўленне папярэдняга расследавання (ГСУ ПР) МУС, і там за справу ўзяліся грунтоўна. Следчыя пачалі разбірацца, на якой падставе дырэктара вызвалілі ў 2007 годзе, калі ён наогул ніяк не супрацоўнічаў са следствам і не даваў паказанняў, з якімі карупцыянерамі ён працаваў па дзяржзамовах.

Як заявіў у судзе Канстанцін Бялоў, яму і ягонаму кліенту так проста і было сказана, што, калі яны зараз не здадуць карупцыянераў з дзяржорганаў, мера стрымання дырэктару ТАА «Белінтэркул» будзе зменена. Акрамя таго, следчыя паабяцалі разабрацца і з дзейнасцю адваката.

Паводле Канстанціна Бялова, менавіта ягоная адмова «стукаць» на сваіх кліентаў і стала прычынай пераследу. Адвакат заявіў у судзе, што ў яго і ягонага кліента патрабавалі звесткі пра карупцыйную дзейнасць намесніка пракурора Мінска Леаніда Літвінюка, пракурора Мінскай вобласці Міхаіла Снегіра, начальніка Папярэдняга расследавання ГУУС Мінгарвыканкама Генадзя Казакевіча, а таксама іншых асобаў, у тым ліку і тых, што займаюць высокія пасады ў Генеральнай пракуратуры.

«Я не чакаў, што ў любімай мной краіне могуць адбывацца такія рэчы і службовыя асобы такога ўзроўню могуць апускацца да такіх метадаў работы», — заявіў у судзе Бялоў.

Апраўданні былога «залатога» адваката Мінска выглядалі вельмі непераканаўча, хоць ён красамоўна размаляваў маштабную змову супраць яго і шэрагу кіраўнікоў праваахоўных органаў, да якіх быццам бы праз яго спрабавалі падабрацца.

Адвакат сапраўды меў шырокія сувязі ў праваахоўных органах і, калі верыць следству, своеасабліва вырашаў праблемы сваіх кліентаў.

Следствам сабраныя доказы таго, што Канстанцін Бялоў не толькі браў салідныя ганарары ад кліентаў міма касы, але таксама падбіваў і атрымліваў ад іх вялікія сумы для перадачы службовым асобам Генпракуратуры, МУС, суда. Прычым сумы, улічваючы ўзровень кліентаў і сувязяў адваката, уражваюць.

Так, паводле звестак следства, дырэктар ТАА «Белінтэркул» быў арыштаваны згодна з пастановай намесніка пракурора Мінска 22 жніўня 2007 года, а ўжо 28 жніўня выпушчаны пад залог. Следства валодае звесткамі, што за сваё вызваленне дырэктар ТАА «Белінтэркул» перадаў адвакату для службовых асоб Генеральнай пракуратуры 50 тысяч даляраў.

У следства ёсць звесткі, што ў іншых выпадках адвакат патрабаваў ад кліентаў і большыя сумы. Напрыклад, для аднаго бізнэсмена цана свабоды была вызначаная сумай у 400 тысяч еўра, што прызначаліся для службовых асоб Генпракуратуры і суда.

Крымінальнай справе ў адносінах да адваката папярэднічаў аператыўны эксперымент, падчас якога было зафіксавана атрыманне ім хабару для службовых асоб Генпракуратуры ў памеры 12 млн рублёў.

Наколькі абгрунтаванае абвінавачванне, вызначыць суд. Аднак канкрэтных карупцыянераў, якім абвінавачваны быццам бы насіў грошы, пакуль не выяўлена.

Хаця, як стала вядома, праверка ў адносінах да некаторых службовых асоб праваахоўных органаў праводзіцца. Пакуль жа адвакату ў судзе прад'явілі абвінавачванне ў здзяйсненні махлярства, падбіванні да дачы хабару і ўчыненні ўрону без прыкметаў крадзяжу.

Сам абвінавачваны не прызнае сябе вінаватым ні пад адным з прад'яўленых абвінавачванняў і настойвае, што ўся справа — суцэльная правакацыя ГСУ ПР МУС, з якім ён адмовіўся супрацоўнічаць.

Асабліва ўразіў аповед абвінавачванага пра тое, як яго затрымлівалі падчас аператыўнага эксперыменту: на спіну скочылі, наручнікі моцна пераціснулі, мяшок на галаву надзелі, білі, прыгаворваючы: «Кажы, сука, як пракурорскім грошы насіў!»

Хаця гэты аповед сведчыць толькі пра неабгрунтаваную жорсткасць групы затрымання, а зусім не пра невінаватасць абвінавачванага. З апошнім разбярэцца ўжо суд. Па справе трэба дапытаць больш за пяцьдзесят сведак, у большасці былых кліентаў адваката. Улічваючы ўзровень некаторых з іх, распаведы кліентаў абяцаюць быць вельмі цікавымі.

Аперупаўнаважаная па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС Вераніка Пасмяццева, каментуючы афіцыйную версію следства пра магчымае атрыманне адвакатам грошай для «рашэння пытанняў» у органах пракуратуры, скрупулёзна падлічыла: «Пры сярэднім заробку Br1,5 млн адвакат ездзіць на «VW Touareg» 2006 года выпуску, яго жонка — на новым джыпе. Сям'я валодае цалкам абсталяванай чатырохпакаёвай кватэрай, будуе катэдж у Мінскім раёне. Дзе можна зарабляць такія грошы?»

**«Ежедневник», «Белгазета»**

## СЦІСЛА

### Выкінула дзіця на сметнік

У кантэйнеры для смецця на гарадской звалцы Слаўгарада быў знойдзены труп немаўляці ў поліэтыленавым пакеце. Устанавіць маці нованароджанай удалося за суткі. Ёю аказалася 29-гадовая мясцовая жыхарка, маці дваіх дзяцей, якая зараз знаходзіцца ў адпачынку па доглядзе за дзіцем. Нарадзіўшы дзяўчынку, яна адразу захінула яе ў поліэтыленавы пакет і праз двое сутак выкінула ў смеццявоз. Жанчына сцвярджала, што дзіця нарадзілася мёртвым, аднак эксперты ўстанавілі адваротнае.

### У Мінску раскрыта жорсткае забойства

19-гадовы раней судзімы мінчанін затрыманы за забойства дзеля грошай для працягу п'янкі. Ён з сябрам гуляў у кабаку, а калі прапілі ўсё, пайшоў у першы-лепшы дом (№3 па вуліцы Русіянава) і пачаў наўздагад званіць у кватэры. У тых, хто адчыняў, спрабаваў вымагаць грошы. Калі гаспадар адной з кватэр вырашыў растлумачыць маладому чалавеку, што ён не мае рацыі, зламыснік дастаў нож і нанёс некалькі смяротных удараў.

### Найбольш забойстваў у Барысаўскім раёне

Летась па краіне найбольш забойстваў было зафіксавана ў Барысаўскім раёне — 19. Столькі ж у Мінскім раёне. Гэта лідэры па статыстыцы. Яшчэ ў 2008 г. лідэрам быў Бабруйск. Але летась там сітуацыя палепшылася — было 9 забойстваў. Пракурор Барысаўскага раёна за кепскую працу вызвалены ад пасады. Летась зафіксаваны рост злачыннасці ў 45 раёнах краіны. Выбухі злачыннасці адзначаныя ў Навабеліцкім раёне Гомеля, Горацкім раёне, Першамайскім і Фрунзенскім раёнах сталіцы.

### Касірка ў банку падмяняла грошы на фальшывыя

У Пінску падчас рэвізіі ў аддзяленні аднаго з банкаў выяўленыя фальшывыя грашовыя купюры: беларускія і расійскія рублі, а таксама еўра і даляры. Папярэдне ўстаноўлена, што фальшыўкі падкінула касірка, 37-гадовая жыхарка вёскі Галёва. Яна затрыманая. Грошы яна друкавала дома на прынтэры.

### Зламаў крэсла пад інспектарам

Пракуратура завяла крымінальную справу ў дачыненні да 24-гадовага маладзечанца, які піхнуў інспектара міліцыі і сарваў з яго міліцэйскай вопраткі жэтон. Інспектар афармляў на нецвярозага мужчыну адміністрацыйны пратакол. Парушальнік так піхнуў міліцыянера ў плячо, што пад інспектарам зламалася крэсла. Пасля дэбашыр хапаў супрацоўніка міліцыі за мундзір і парваў яму пагон. Максімальнае пакаранне за такое злачынства — шэсць гадоў пазбаўлення волі.

### Падлеткі выцягнулі з пажару суседа

Увечары 24 студзеня ў вёсцы Старадубавая (Гродненскі раён) загарэўся жылы драўляны дом. Жыццё яго гаспадара да прыезду пажарнікаў і «хуткай» выратавалі трое хлопчыкаў.

Гуляючы на вуліцы, 8-гадовы Дзяніс заўважыў дым з суседняга дома. Пакуль бацька малога тэлефанаваў у службу выратавання, яго старэйшыя браты пабеглі да палаючага будынка. 12-гадовы Уладзь імгненна праскочыў праз кухню ў пакой, дзе і знайшоў гаспадара. Разам са старэйшым на два гады братам Яўгенам ён выцягнуў непрытомнага мужчыну на вуліцу. Цяпер выратавальнікі думаюць , як узнагародзіць юных «калег» за мужны ўчынак. Меркаваная прычына пажару — выпадзенне вуглёў з печы на рыззё.

### У Еўропу трапіў гераін, заражаны сібірскай язвай

Сямёра наркаманаў памерлі ад вугліка (сібірскай язвы) у Шатландыі, адзін — у Нямеччыне, заразіўшыся праз гераін. Медыкі баяцца новых выпадкаў захворвання сібірскай язвай. Споры яе, дарэчы, могуць выкарыстоўвацца як біялагічная зброя.

**Хрысціна Марчук; Зміцер Панкавец; СМ; БелаПАН**

# Драпежныя рэчы XXI стагоддзя

Тое, што героі Стругацкіх называлі зняважлівым словам «слег», мы сёння называем «віртуальнай рэальнасцю». Піша **Віталь Тарас**.



### Канцавая станцыя прагрэсу

Кажуць, білеты на стэрэаверсію «Аватара» ў мінскім кінатэатры «Кіеў»выкупленыя на месяц наперад. Можа стацца, пачаткам XXI стагоддзя будучыя гісторыкі будуць лічыць не тэрарыстычную атаку на WTC у Нью-Ёрку 11 верасня 2001 года, але рубеж 2009—2010 гадоў, калі ў пракат выйшаў галівудскі блакбастэр Джэймса Кэмерана. Гэта не толькі цуд камп'ютарнай тэхнікі на мяжы фантастыкі, але і сапраўдны трыумф глабалізму.

Днямі ўлады КНР знялі «Аватар» з кінапракату, каб ён не ствараў канкурэнцыі кітайскай кінапрадукцыі. Дарэчы, некаторыя кітайцы ўгледзелі ў фільме пра планету Пандора адлюстраванне жыллёвых праблем у перанаселеных кватэрах Паднябеснай. Напрыклад, эпізод, дзе пандорскія тубыльцы спяць у гамаках...

За пару месяцаў пракату ў свеце «Аватар» сабраў 1,8 мільярда даляраў. Відаць, барацьба з глабальным крызісам паспяхова завершылася. Чалавецтва прыбывае на канцавую станцыю «Аватар».

Вышэй за ўсіх кінакрытыкаў і культуролагаў у свеце шэдэўр ацанілі расійскія камуністы. Дакладней — Цэнтральны Камітэт камуністаў Пецярбурга і Ленінградскай вобласці, які пад уражаннем ад убачанага прыняў спецыяльную заяву. Ніводзін фантаст не здолеў бы выдумаць падобны дакумент.

### Аватары ўсіх краін, яднайцеся!

Аўтары заявы сцёрлі мяжу між фантастыкай і рэальнасцю.

«Фільм Кэмерана — частка езуіцкага плана адміністрацыі Абамы ў фармаванні вобраза добрага дзядзечкі Сэма... Кэмеран... перанёс дзеянне свайго прымітыўнага прапагандысцкага фільма ў створаны А. і Б. Стругацкімі свет планеты Пандора. Гэтая планета была адкрытая і палітая крывёй савецкіх касманаўтаў (!)... Кэмеран... пасылае ў космас зухаватага дэсантніка — забойцу і прыгнятальніка Ірака, Югаславіі, Афганістана, Гаіці і Самалі... Біёлаг-нацыст Сігурні Уівер яскрава дэманструе мэты рэформы амерыканскай сістэмы аховы здароўя, якую праводзіць адміністрацыя Абамы...»

Ці трэба казаць, што на завяршэнне свайго гуманнага паслання «камунары»заклікаюць арыштаваць рэжысёра фільма.

### Антыўтопію — ў жыццё

Адначасова ў расійскім інтэрнэце з'явілася інфармацыя, быццам Барыс Стругацкі абвінаваціў аўтараў «Аватара» ў плагіяце. Пісьменнік публічна абверг недарэчную выдумку. Ніякіх перасячэнняў, апроч супадзення ў назве планеты, паміж сцэнаром амерыканскай стужкі і старой аповесцю братоў Стругацкіх «Свята поўдня. XXII стагоддзе» няма.

Творчасць камуністаў Ленвобласці сапраўды выклікае ў памяці творы Аркадзя і Барыса Стругацкіх — але не тыя, дзе перамагаюць «ідэалы сацыялізму», а сатырычныя. Напрыклад, «Казка пра тройку» з такім персанажам, як дэмагог Хлебаўводаў. Або апавяданне пра тое, як савецкі крытык зарэзаў кнігу маладога фантаста на той падставе, што яе героі лётаюць на касмалёце з хуткасцю, вышэйшай за хуткасць святла. Паколькі гэта абвяргае пастулат Альберта Эйнштэйна, а Эйнштэйн у свой час быў вымушаны эміграваць з нацысцкай Германіі, крытык зрабіў выснову, што аўтар кнігі — фашыст. Падобная логіка прысутнічае ў развагах цяперашніх крытыкаў-камуністаў.

Яшчэ ў 1960-я на змену тыпова савецкай фантастыцы кшталту «Краіны барвовых хмараў» у творчасць Стругацкіх прыйшло тое, што яны самі назвалі «фантастыкай блізкага прыцэлу». Напрыклад, аповесць «Драпежныя рэчы ХХ стагоддзя», якую Барыс Стругацкі нядаўна назваў адным з самых прарочых сваіх твораў. У кніжцы братам (Аркадзь Стругацкі памёр некалькі гадоў таму) удалося ўгадаць «шлях чалавецтва на бліжэйшыя дзесяцігоддзі, шлях да постіндустрыяльнага грамадства, грамадства спажывання».

Аўтары лічылі, што пішуць антыўтопію, апісваюць зусім гнюсны свет. Але тое, што героі кнігі называюць зняважлівым, пахабным, паводле задумкі аўтараў, словам «слег», сёння мы называем «інтэрнэтам», «экстазі», «віртуальнай рэальнасцю». А слова «слягач» лёгка замяніць словам «блогер».

### Пах будучыні

Фантаст і філосаф Барыс Стругацкі лічыць, што будучыню прадказаць немагчыма. «Можна прадказаць дух будучыні, як Уэлс прадказаў дух ХХ стагоддзя, — упэўнены ён. — Але гэта аўра, гэта міраж, ніякіх дэталяў, ніякай канкрэтыкі. Як жыхары амазонскіх джунгляў нічога не могуць сказаць пра свет сучаснай цывілізацыі. Хай нават яны сустракаюцца з асобнымі еўрапейцамі, хай нават яны бачаць тэлевізар, самалёт, але скласці хоць нейкае ўяўленне пра тое, які ж ён, гэты свет — яны не змогуць».

У тым самым інтэрв'ю прагучаў маленькі фрагмент запісаў, зробленых братамі Стругацкімі на пачатку 1960-х. Толькі-толькі скончылася хрушчоўская «адліга». Яшчэ наперадзе працэс дысідэнтаў Сіняўскага і Даніэля, суд над Іосіфам Бродскім, якога абвесцяць «дармаедам», уварванне савецкіх танкаў у Чэхаславакію. Але вось пра што думалі літаратары-фантасты ў 1963 годзе: «Не трэба надзей на светлую будучыню. Намі кіруюць жлабы і ворагі культуры... Яны заўсёды будуць супраць нас. Яны ніколі не дазволяць нам казаць тое, што мы лічым слушным...»

Што-небудзь істотна змянілася за паўдзесят гадоў? Прынамсі, «аўра», «дух» засталіся, як у ХХ стагоддзі.

Заява пецярбургскіх камуністаў нагадвае трызненне. Чалавецтва, паводле Маркса, смяецца, развітваючыся са сваім мінулым. А нядаўні заклік мінскіх камуністаў аднавіць помнік Сталіну ў сталіцы Беларусі — таксама смешнае трызненне? Ці прагноз на бліжэйшую будучыню? А можа, мы проста яшчэ не выйшлі з джунгляў? Хоць ужо маем магчымасць глядзець «Аватар» у 3D-фармаце.

# Залатыя яйкі Альгерда

Па-мулявінску вусатыя гастарбайтэры Лёнік і Генік, былыя выкладчыкі бабруйскага ВНУ, прыехалі рабіць рамонты ў Маскву. Яны яўна не ў тэме: на душавую кабінку думаюць, што гэта ліфт; млеюць, пабачыўшы мадэлек на подыуме. Яшчэ яны мараць закалаціць 500 RUR, каб дома купіць на іх аграгарадок. Раней беларусы жылі заможна, чаму зарукай былі залатыя яйкі вялікага князя Альгерда (тыя самыя, з якімі ён на Вялікдзень 1370 г. выправўляўся ў паход на Маскву). Але яйкі выкраў расійскі алігарх, і беларусы ад галечы ратуюцца заробкамі ў РФ. У Маскве таксама ёсць добрыя людзі: яны дапамагаюць беларусам вярнуць яйкі. Урэшце — хэпі-энд, танцы, феерверк...

Замяніце беларускіх гастарбайтараў на таджыкскіх, а Альгерда — на Чынгісхана і атрымаеце сюжэт фільма «Яйкі лёсу». Ён складзены на аснове рэпрызаў з тэлеперадачы «Наша Russia».

Перадачы, дзе ў парадыйным выглядзе паказваюцца праблемы грамадства, ёсць у многіх краінах. Напрыклад, англійская называецца «Маленькая Брытанія». Але аўтары «Рашы» і «Яек» не прапануюць Расіі смяяцца з сябе. Яны імітуюць гэты смех. Калі забаронена кпіць з Пуціна (можна згубіць ліцэнзію), калі нельга корпацца ў расійскіх комплексах і фобіях (можна згубіць касу), давядзецца сцвердзіцца за рахунак іншага, слабейшага. І шліфануць сюжэт наўмысна непрыстойнымі, «ніжэй поясу», жартамі.

У фільме ювелірна дакладна перададзены нерв і атмасфера сучаснай Расіі. Чаго зусім няма ў змалпаванай, але бесканфліктнай «Нашай Беларашы». У «Яйках лёсу» пададзены дакладны злепак з рэчаіснасці: у процістаўленні моцы з немаччу першая заўсёды перамагае з сытай усмешкай. Гумар фільму можна назваць гумарам бота на горле.

Ялейны Баскаў у «Яйках» грае самога сябе. Ён рассцілаецца перад спонсарам-алігархам. Самаіронія, здавалася б? Але ў гэты самы момант Баскаў на нашых вачах і за нашы ж грошы шліфуе свой імідж, дасканаліць медыйную ўсёбаковасць.

А калі адзін з герояў, сярэднестатыстычны мужык, нібы жартам пачынае кпіць з нерасійскіх прозвішчаў у фінальных тытрах, ты чуеш, наколькі ён гэта ўсур'ёз.

**Ліза Кавальчык**

**«Наша Russia. Яйкі лёсу»** (камедыя, 81 хв., 2010, Расія, рэж. Глеб Арлоў).

# Ціхія Міроны

Сяргей Каваленка рызыкаваў уласным жыццём і воляй, каб усталяваць сцяг. Але на такі яскравы подзвіг здольны не кожны. Многія абіраюць подзвіг ціхі і штодзённы. Аздабляюць налепкай з «Пагоняй» свае аўто, носяць на грудзях бел-чырвона-белы значак. Штодня іх знакі незалежнасці бачаць дзясяткі людзей. Такім чынам — пяць праяваў персанальнай міронаўшчыны.

### Аўтамабільныя міроны

Не-не, а сустрэнеш у аўтамабільнай плыні налепку «Пагоня» на бамперы персанальных аўто. А яшчэ там з'яўляецца прадугледжанае ДАІ спалучэнне літар BY на «непрадбачаным» бел-чырвона-белым фоне.

Да ведама аўтааматараў: яшчэ летась прэсавая служба ДАІ заявіла, што за бел-чырвона-белыя стужкі на антэнах аўто штрафаваць не будуць. Пры ўмове, калі на стужцы няма рэкламы.




### Незалежнасць ад Леніна

Гэта пачалося ў 2003 годзе, калі назву станцыі метро «Плошча Незалежнасці» перайменавалі назад у «Плошчу Леніна». Тады нехта ўзяў фламастэр ды на схеме ліній у вагонах пачаў выпраўляць «Леніна» назад на «Незалежнасці». Нягледзячы на пагрозу штрафу за пашкоджанне дзяржаўнай маёмасці — як тое было летась са студэнтам Кастусём Шыталем, — перакрэсленыя Леніны сустракаюцца дагэтуль. Гэтак і цягнецца ціхае процістаянне: адны здзіраюць, іншыя (супрацоўнікі метро) наклейваюць паўзверх адмыслова выштукаваныя налепкі са словамі «Плошча Леніна».

### Які ж рукаў без флікера?

Значак з нацыянальным сцягам і волялюбнай сімволікай — самы папулярны спосаб публічна выказаць свае палітычныя і грамадзянскія прыхільнасці. Такія пабачыш і на штрыфлях пінжакоў актывістаў сталага веку, і на шлейках заплечнікаў моладзі.

У 2008 годзе актывісты Руху «За Свабоду» выпусцілі першую серыю флікераў з выявай нацыянальнага сцяга. Флікер можна мацаваць на заплечніку ці вопратцы. Паводле стваральнікаў, ён не толькі прадухіляе страту гістарычнай памяці, але і ДТЗ.

### Калі форма не адпавядае зместу

Калісьці гэтыя вокладкі рабілі фабрычна, бо ў іх можна было абгарнуць адпаведны дакумент — у 1994—1995 гадах у Мінску пачалі выдаваць пашпарты з «Пагоняй». Цяпер абгорткі з гістарычнай сімволікай Беларусі выштукоўваюць неафіцыйна, каб абгарнуць у іх дакументы з зусім іншымі сімваламі.

### Беларусь, наперад!

Калі міліцыя пачала затрымліваць тых, хто прыйшоў на футбол з бел-чырвона-белым сцягам, большасць заўзятараў перайшла на шалікі з «Пагоняй». Сцягі ж перазахоўваюцца для выязных гульняў нашых зборных. Тады беларускі сектар упораўнень з клічам «Жыве Беларусь!» расквечваецца бел-чырвона-белай палітрай. Яна часам апынаецца ў аб'ектыве сусветных СМІ, як тое было на чэмпіянаце свету ў Швейцарыі ў 2009-м.









**ЛК**

# Алесь Язвінскі: Патомны настаўнік з Нясвіжа

Працяг са старонкі 2.

Настаўнік прыгадвае свайго дзеда па бацькавай лініі, выпускніка Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі: «Дзед расказваў, што найлепшы час для ягонай прафесіі быў за палякамі — за месячны заробак ён мог купіць карову. Слова пана настаўніка было законам». Прыйшлі саветы, пачалася калектывізацыя. Вяскоўцы завіталі да настаўніка раіцца, ці ісці ў калгас. Ён ім кажа — ісці, бо зямлю адбяруць у любым выпадку, а не аддасі сам — паедзеш з дзецьмі ў Сібір. Так ён спрычыніўся да арганізацыі першага калгаса на Стаўбцоўшчыне.

> Такога ў школе нават за Брэжневым не было.

Цяпер у настаўніка няма таго аўтарытэту, яго ніхто не слухае, нават дзеці. А заробак — смешны.

Тым не менш, сыны Язвінскага абралі педагагічную адукацыю. Праўда, старэйшы, Зміцер, па спецыяльнасці не працуе, іграе ў музычным гурце «Рахіс». А вось Юра, малодшы, пайшоў у бацьку — вучыцца на настаўніка фізвыхавання. Дачка Наталля паступіла ў Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт.

### Будзь гатовы да беспрацоўя

Спадар Алесь — сябар Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі БНФ, у Фронце ад пачатку існавання арганізацыі. На пытанне, што значыць быць настаўнікам-апазіцыянерам у маленькім гарадку, спадар Алесь адказвае проста: «Працу і палітыку не змешваю». У горадзе і раёне яго добра ведаюць як фронтаўца, выдаўца папулярнай у Нясвіжы газеты «Брама». Але ў школе Алесь Язвінскі толькі настаўнік. Адно што выхоўвае ў дзяцей пачуцце патрыятызму. Ладзіць летнікі ў Мікалаеўшчыне, на радзіме Коласа, арганізоўвае выезды на святы сярэднявечнай культуры.

Да сур'ёзных канфліктаў з чыноўнікамі ў Язвінскага ніколі не даходзіла. Былі інцыдэнты, кажа настаўнік, але вертыкальшчыкі заўсёды намагаліся дзейнічаць у рамках існых законаў. Аднойчы нясвіжскія фронтаўцы нават выйгралі суд у райвыканкама. Пагроза прыйшла не адтуль, адкуль ён чакаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Яе ідэал — маўклівая, бездзэйная істота

Спадар Алесь некалькі дзён не мог сабрацца з думкамі пасля візіту да чыноўніцы з Мінаблвыканкама.

**Алесь Язвінскі**

нар. у 1957 у вёсцы Омельна Пухавіцкага раёна. Ад 1979 выкладае фізвыхаванне ў школе №3 Нясвіжа. Жанаты. Мае двух сыноў і дачку.

Ад настаўніка з Нясвіжа разам з шасцю іншымі педагогамі кіраўніца абласнога аддзела адукацыі запатрабавала выйсці з апазіцыйнай партыі (гл. «НН» №3). Інакш страціш працу.

«Я не трымаю на людзей крыўды. І на Таісу Данілевіч як на чалавека не крыўдую, бо не мне яе судзіць. Але мне робіцца жахліва ад думкі, што такія людзі, як яна, кіруюць на вярхах, ды яшчэ ў сістэме адукацыі. Яе ідэал настаўніка — маўклівая, бездзэйная істота, гатовая выканаць любы загад».

Ён не хваліць сябе, не заломвае рук. «Я працую, як атрымліваецца, як працуе большасць. Не дасягнуў вышыняў, але і не маю спагнанняў, каб быць звольненым». У шафе ягонага школьнага кабінета, нібыта пратэстуючы супраць лішняй сціпласці гаспадара пакоя, ляжыць стос грамат за спартыўныя дасягненні школьных камандаў.

**Сямён Печанко, Нясвіж—Мінск**

# Івянец не прагнуўся: Тарэсу Собаль перавыбралі

Стаўленнік лукашэнкаўцаў пацярпеў паразу — яго нават не пусцілі ў будынак.

Сходу папярэднічаў псіхалагічны націск на ранейшае кіраўніцтва і тых сяброў СПБ, якія вырашылі падтрымаць Тарэсу Собаль.

Супраць Собаль распачалі крымінальную справу. Маўляў, не сплаціла падаткаў з матэрыяльнай дапамогі, якую атрымаў аддзел СПБ. Напярэдадні мясцовая раёнка надрукавала на першай паласе інфармацыю аб выключэнні спадарыні Собаль з Саюза палякаў С.Сямашкі, а ўвесь Івянец быў залеплены абвесткамі аб хуткіх выбарах новага кіраўніцтва. У адказ падтрымаць Т.Собаль прыехалі сябры арганізацыі з самых розных рэгіёнаў.

«Мы прыехалі абараняць Дом польскі. Праўладны Саюз палякаў рыхтуе яго захоп, і мы сабраліся, каб абараніць мясцовых палякаў. Мы прыехалі з Мінска, з Гродна. Адусюль», — расказаў «НН» сябра непрызнанага ўладамі СПБ Яўген з Гродна.

У Івянцы Дом польскі займае вялікі будынак былога ўнівермага.

Гасцей было насамрэч багата. Нягледзячы на тое, што 46 чалавек былі затрыманыя ДАІ па дарозе ў Івянец на вартых смеху падставах. Маўляў, трэба разабрацца, ці яны не датычныя да крадзяжоў на дачах перад Новым годам. Уезд у мястэчка нагадваў блокпост — адразу некалькі машын ДАІ правяралі транспарт на пад'ездах да Івянца. Мы, журналісты, самі ледзьве прарваліся.

У будынак Дома польскага пускалі ўсіх ахвотных. Адмовілі толькі здымачнай групе БТ, якая не асабліва настойвала і паўторна з'явілася толькі калі ля ўваходу ў будынак паказаўся С.Сямашка. Якому адразу было заяўлена наступнае: «Пан ест персонай нонграта на тэрыторыі Дома польскага». Спадар Сямашка спрабаваў запрасіць прысутных у Дом культуры, дзе ўжо пачынаўся выступ ансамбля «Бяседа» (а адначасова і выбары праўладнага старшыні Дома польскага), аднак заклікі тыя ніхто не слухаў. Цікава, што С.Сямашка пачаў агітаваць за «нашу беларускую мову», калі яго папракнулі ў няведанні польскай. Напэўна, менавіта тое і было патрэбна БТ.

«Без накладак прайшло?» — запытаў С.Сямашка ў суправаджаючага яго маладзёна, калі адышоў на пару дзясяткаў метраў ад натоўпу.

А сход прайшоў узнёсла. Удзел у выбарах старшыні Дома польскага прымалі толькі івянчане, якіх сабралася 157 чалавек — большая частка мясцовай польскай грамады. Слова давалі ўсім ахвотным, з чаго не прамінулі скарыстацца і прыхільнікі афіцыйнага Саюза палякаў. Крытыку перапоўненая зала сустракала апладысментамі. Аднак добрых словаў у адрас старшыні — Тарэсы Собаль — было значна больш. У выніку за яе пераабранне прагаласавалі амаль адзінагалосна.

«СПБ у Івянцы бароніць сябе. Нягледзячы на рэпрэсіі, нягледзячы на цяжкую сітуацыю», — пракаментавала «НН» выніку сходу старшыня непрызнанага ўладамі Беларусі Саюза палякаў Анжаліка Борыс.

Праз 15 хвілін пасля сканчэння мерапрыемства ў івянецкім Доме польскім знікла электрычнасць. Нібыта даючы зразумець, што сістэма таксама яшчэ не здаецца.

**Алесь Пілецкі, Юлія Дарашкевіч (фота), Івянец—Мінск**



**Тарэса Собаль.**


**У залу не быў дапушчаны кіраўнік лукашэнкаўскага Саюза палякаў Станіслаў Сямашка і здымачная група БТ.**


**Падтрымаць Тарэсу Собаль прыехала кіраўніца незалежнага Саюза палякаў Анжаліка Борыс.**

## Сёння мы з Тарэсай Собаль

Справа СПБ — пытанне прынцыпаў. Заклікаю беларускую інтэлігенцыю быць побач з Анжалікай Борыс, Тарэсай Собаль, Пачобутам. Піша **Андрэй Дынько**.

У 2006 годзе Народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін і «Наша Ніва» ўзнялі свой голас у абарону актывістаў польскай нацыянальнай меншасці. Калі дайшло да крымінальных справаў супраць усяго кіраўніцтва непрызнанага афіцыйнымі ўладамі Саюза палякаў, калі лідэрцы палякаў Анжаліцы Борыс падкінулі на мяжы амфетамін, «НН» апублікавала каментар «Сёння мы ўсе палякі». Тыя крымінальныя справы ўрэшце замялі.

Спроба расправы над Тарэсай Собаль у Івянцы прымушае нас ізноў паўтарыць пастулаты, пра якія пісалі ў 2006-м.

Справа СПБ і падобная, і не падобная да ранейшых разгонаў «незарэгістраваных арганізацый». Па-першае, у гэтым выпадку гаворка не пра арганізацыю беларусаў, а пра арганізацыю меншасці, а, па-другое, вылучаюцца абвінавачванні паводле крымінальных, а не палітычных артыкулаў.

Прычым мучаць якраз тых польскіх актывістаў, якія ведаюць беларускую мову, прызнаюць і любяць беларускую культуру, звязваюць сваю будучыню з незалежнай Беларуссю.

Ніхто з іх не ставіць пытання пра адрыванне якіхсьці там тэрыторый ці ігнараванне беларускай культуры. Гаворка пра іншае: аўтаномію асобы, супольнасці, культуры ад дзяржавы.

Грамадзянам хочуць паказаць, што ўсе прэтэнзіі на такую аўтаномію будуць спыняцца й караццa. Для паказальнага пакарання выбраныя тыя, хто заведама ў меншасці, — польскія актывісты.

У адносінах з палякамі беларусы мелі ўсякага. Крыўдавалі, адбіваліся. Было сполішчанне, дзяржаўныя імперыялістычныя памкненні і правінцыйная шавіністычная фанабэрыя, якую мы дагэтуль назіраем у дзейнях некаторых ксяндзоў на Гарадзеншчыне. Гэта не павінна засланяць ад нас сутнасці справы Собаль. Ідзе гаворка пра абарону слабейшага, права бяспраўнага, асновы стаўлення да нацыянальных і іншых меншасцяў у Беларусі.

Выпрабоўваецца не толькі замацаваны ў канстытуцыі прынцып дэмакратыі, свабоды асацыяцыі (яго не раз бралі пад ногі разам з іншымі канстытуцыйнымі асновамі, нам не прывыкаць), але іншы фундаментальны прынцып Рэспублікі — роўнай для грамадзянаў усіх нацыянальнасцяў.

Так, як Собаль, безабаронныя ўсе мы.

Цяпер у Беларусі апраўдальных прысудаў выносіцца меней за долю працэнта.

Прымяненне закона зрабілася выбарачным. Закон распаўсюджваецца не на ўсіх і абараняе не ўсіх. Адной асобе, адным суб'ектам гаспадарання дазволена жыць па законе, а другім — няўгодным асобам, меншасцям ці няўгодным СМІ — толькі па адвольна вызначаных паняццях, прыкрытых фігавым лістком «дзяржаўнай неабходнасці» ці «адносінаў суб'ектаў гаспадарання».

Жыццё дзяржавы па паняццях падрывае дзяржаўную сістэму, расколвае грамадства з сярэдзіны. Вось чаму змагары за справядлівасць для Собаль, для СПБ змагаюцца таксама за моцную Беларусь.

Нацыянальныя меншасці павінны мець права дзейнічаць без дзяржаўнага кантролю, кантактаваць, з кім хочуць, і ўладжваць свае справы, як хочуць. У такім дазваленні будзе сіла нацыі.

Стратэгіяй умацавання грамадства павінна стаць інтэграцыя, а не сегрэгацыя. У адваротным выпадку Беларусь ніколі не выйдзе з моўных, культурных і рэлігійных расколаў, пасеяных у эпоху каланіяльнае залежнасці.

Калісьці ў справе Дрэйфуса ў абарону французскага габрэя рашыўся выступіць Эміль Заля. Гэта дазволіла абараніць нявіннага.

Справа Собаль сёння, як учора была справа Борыс, — пытанне выбару прынцыпаў для будучае Беларусі.

Сярод дэмаралізацыі, намаганнямі волі сярод бяссілля яны закладаюцца і стануць запатрабаванымі праз нейкі час, каб дзейнічаць пасля доўга.

Абвінавачванні супраць польскіх актывістаў — гэта яшчэ зняволенне хлуснёю.

Моўчкі выконваюць заведама незаконныя загады інспектары ДАІ і супрацоўнікі КДБ.

На жаль, памоўчваюць палітыкі — баяцца пераступіць праз забабоны мінулага,


**Дом польскі ў Івянцы.**

пабойваюцца, што іх палічаць прапольскімі, калі яны пачнуць занадта гаварыць пра польскую меншасць.

Хачу нагадаць ім пра Махатму Гандзі, які ішоў да недатыкальных і ганарыўся тым.

Разумеем, што ні «Літаратура і мастацтва», ні БТ не знойдуць спосабу выказаць салідарнасць з палякамі, з сумленнымі, чыстымі жанчынымі, якіх звінавачваюць у крымінале.

Абавязак ачышчэння нацыянальнае душы ад грэху ляжыць на тых дзеячах культуры, грамадскіх дзеячах, якія захавалі здольнасць да дзеяння і смеласць супрацоўнічаць з незалежнымі СМІ.

Так, нашы галасы мала хто лічыць і важыць. Істотна, што яны гучаць. Мусім гаварыць пра злачынствы савецкага шавінізму, нават калі наш голас чуюць пакуль толькі некалькі дзясяткаў тысячаў суайчыннікаў. Пакуль хоць адзін чалавек гаворыць аб праўдзе, нічога не страчана.

Заклікаю беларускую інтэлігенцыю быць побач з Анжалікай Борыс, Тарэсай Собаль, Пачобутам. Бачу ў тым абавязак інтэлігента і грамадзяніна.




**Гаргара. Лядовы палац у Баранавічах.**

## Мода на спорт

### Новы лядовы палац у Баранавічах — апошняя тэма для гутарак мясцовага люду.

Гэта не толькі самы вялікі культурна-фізкультурны будынак у горадзе. Гэта нібы новы музей, дзе большасць спяшаецца пабываць. Каб потым расказваць сваякам і знаёмым, выхваляцца перад сябрамі.

Па палацы водзяць платныя экскурсіі. Каб пакатацца на лёдзе, трэба купляць квіткі за некалькі гадзінаў. А нават маючы квіток, мусіш прыходзіць за гадзіну да свайго тэрміну — адстаяць чаргу па канькі. Час коўзання — 45 хвілін.

Стаяць на каньках тых мала хто добра ўмее. За першыя тры дні новага года «хуткая» звезла з лядовага палаца пятнаццаць чалавек — страсенне мазгоў, пераломы, вывіхі. Плятуць чуткі, быццам нават адзін вялікі чыноўнік трапіў у шпіталь.

У палацы заўсёды дзяжурыць доктар, які вырашае — ці выклікаць «хуткую», ці фігурыст-небарака дасць сабе рады сам.

У горадзе з'явіўся попыт на канькі. Каб не марнець у чэргах, каб мець свае ўласныя… У розных частках горада залілі каткі… Гарвыканкам перад праваслаўным Раством правёў лыжны забег вакол палаца.

На пачатку года ў прэсе было абвешчана, што сёлета побач з лядовым распачнуць будову воднага палаца.

— Сталін мяне выхаваў! — равеў на ўвесь аўтобус стары з дзіцячымі лыжамі ў руках. — Бацька Сталін… Я плакаў, калі ён памёр, ля калгаснага рэпрадуктара… Мы тады ўсе фізкультурай займаліся, на лыжах бегалі, на каньках… А цяперашняя моладзь папрывыкала за камп'ютарам сядзець… Інтэрнэт ім давай, мабільныя тэлефоны… Сталіна на іх няма!

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## У завіруху

Завея замяла твае сляды
У накірунку вуліцы Цэнтральнай,
Сюжэт — банальны і запамінальны,
Засумаваў бамонд правінцыяльны,
У палоне снежным — сёлы, гарады,
Завея замяла твае сляды.

Увесну — зноў у квецені сады,
Ты страпянешся ў сукенцы бальнай,
Насустрач ён — прыгожы, малады
Юнак непрадказальна геніяльны,
Што паступаць збіраўся ў тэатральны
Увесну, калі ў квецені сады.

Усмешка лета з пырскамі вады,
І на Лахве ў дзятвы — сезон купальны,
Ты зноў прыйшла, чароўная, сюды.
На лузе бусел — доўгі і худы
Палюе жаб, зязюлі плач кранальны.
Усмешка лета з пырскамі вады.

Дажджамі плача восень у халады,
Такой бяды — шлях уратуе дальні,
Сустрэнемся на Мальце, там, дзе пальмы,
Зноў на пяску чытаць твае сляды.
Лунае ў паветры звон вянчальны,
І не для нас — дажджы і халады.

**Алесь Сакалоў, Баркалабава (Быхаўскі раён)**

## Прадаюць найлепшыя прадпрыемствы

### У 1991 годзе, за Шушкевічам і Пазняком, быў прыняты закон: усе прадпрыемствы на тэрыторыі беларускай дзяржавы зрабіліся яе ўласнасцю. А цяперашняе кіраўніцтва найлепшыя прадпрыемствы прадае расійскім кампаніям.

«Белтрансгаз» прададзены расійскаму дзяржаўнаму «Газпрому», БПС-банк — «Сбербанку». Ідзе захоп беларускіх эканамічных багаццяў расійскай дзяржавай і бізнэсам, а наша кіраўніцтва робіць выгляд, што так і трэба. Называюць гэта «замежнымі інвестыцыямі».

У палітыцы часта, каб замаскіраваць сапраўдныя намеры, ужываюцца хлуслівыя фармулёўкі. Вайну ў Афганістане ў Савецкім Саюзе называлі «выкананнем інтэрнацыянальнага абавязку». Нядаўнюю вайну ў Грузіі Масква называла «прымушэннем Грузіі да міру», а свой вайсковы кантынгент — «міратворцамі».

Падобнае можа адбывацца і ў эканоміцы. Сілавы захоп уласнасці дапаўняюць дзеля маскіроўкі праплатай нейкіх грошай.

Як можна такія прадпрыемствы прадаваць? Калі ўрад не разумее, што такое дбаць пра нацыянальныя інтарэсы, дык хоць былі б элементарнымі прагматыкамі. Дык жа і гэтага няма.

**Таццяна Шаклач, Мінск**

## Як міліцыя нас сцеражэ

### Міліцыянт ударыў яго яшчэ раз — нагой у грудзі, сеў у машыну і паехаў далей.

Неяк нядаўна ў Докшыцах давялося назіраць не вельмі прыемную карціну. Вяртаўся я ўвечары з касцёла. Міма мяне пранеслася міліцэйская машына і раптам спынілася.

Прыгледзеўся. Аказваецца, непадалёк ля плота стаяў п'янаваты чалавек. Да яго і падышоў міліцыянт і пачаў яму штосьці казаць. Чалавек ці то не звярнуў увагі, ці то агрызнуўся — мент даў яму кулаком у твар. Мужык аж сеў ад нечаканасці. І ў той час «вартавы парадку» ўдарыў яго яшчэ раз — нагой у грудзі, сеў у машыну і паехаў далей.

Хай сабе чалавек і быў п'яны, але ж ён чалавек і ставіцца да яго трэба па-чалавечы. Але, здаецца, міліцыя лічыць, што ёй усё дазволена.

**Дакшычанін**

## Гумар беларускай міліцыі

### Стаянне ў ачапленні ўздоўж дарогі, калі з аэрапорта вязуць высокага госця, называецца «гнаць кабана».

Калі ў Мінск прыязджаюць высокія госці, на цэнтральныя вуліцы немагчыма высунуцца — усё перакрыта, абшукваюць з металашукальнікам на выхадзе з «соткі». Па праспекце гойсаюць картэжы з высокімі гасцямі.

Знаёмы міліцыянер расказваў, што ў іх стаянне ў ачапленні ўздоўж дарогі, калі з аэрапорта вязуць высокага госця, называецца «гнаць кабана». Картэж ляціць, а яны перадаюць па рацыі наступным «праследаваў…» Так і гоняць да самых Драздоў.

**Ігар Ок., Мінск**

## Не кажы мове «Не»

### Пішу ў дзяржаўную структуру па-беларуску, а адказы прыходзяць на расійскай мове.

Вось такая сітуацыя адбылася з адным з жыхароў Бабруйскага раёна, сябрам аргкамітэта Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, спадаром Аляксандрам Леаненкам.

— 12 кастрычніка, — кажа ён, — я стаяў у Бабруйску на прыпынку і чакаў аўтобус № 13. Калі ён прыехаў, то памяняў шыльду з нумарам на 13-А. Аднак аўтобус паехаў па маршруце № 13. Я звярнуўся ў бабруйскі аўтобусны парк №2. Мой ліст быў напісаны па-беларуску, а адказ прыйшоў на расійскай мове. Там было напісана, што меры будуць прынятыя.

Праз два месяцы гісторыя паўтарылася. У гэты раз ужо жонка спадара Аляксандра села на аўтобус, які змяніў маршрут. Сам спадар Аляксандр чакаў у гэты час жонку разам з сынам на апошнім прыпынку.

Тады спадар Леаненка ў другі раз звярнуўся ў аўтапарк і настойліва папрасіў адказаць яму па-беларуску. Адказ прыйшоў зноўку на расійскай мове. У ім было сказана, што ў адпаведнасці з Канстытуцый дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца расійская і беларуская. Прыярытэту Канстытуцыяй не вызначана. Асноўная перапіска з аўтапаркам ажыццяўляецца на расійскай мове. «Але гэта не значыць, што беларускую мову мы не лічам сваёю роднаю моваю», — падсумоўвае дырэктар аўтапарка №2 спадар Стэльмак.

Згодна з артыкулам № 5 закона «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь» «адмова службовай асобы прыняць і разгледзець зварот грамадзяніна на беларускай, расійскай мовах са спасылкай на няведанне мовы звароту» цягне за сабою адказнасць згодна з дзеючым заканадаўствам. А Закон «Аб мовах» у артыкуле 4 абавязвае кожную службовую асобу «валодаць беларускай і расійскай мовай у аб'ёме, неабходным для выканання службовых абавязкаў». А ці не ёсць адказ на зварот такім службовым абавязкам?

**Яўген Васьковіч, Бабруйск**

## Расійская культура ў Беларусі — другасная

### Напісаць гэты ліст я вырашыў, чуючы, як надакучліва на расійскай мове наша радыё «Культура» ўціскае ў мае глузды сцверджанні накшталт: «Пушкін — наш вялікі паэт», «Святкаванне Новага года ў нас пачалося на загад Пятра Вялікага». І іншыя паведамленні, падобныя на тое, што Скарына друкаваў Біблію ў Пецярбургу.

Ці магчыма замяніць нашу культуру на расійскую? Расійская культура ў Беларусі мае спецыфічныя рысы, якія замінаюць абапірацца ёй на нашы традыцыі, мадэлі мыслення, нашы каштоўнасці. Яна не першага гатунку, бо адарваная ад сваёй глебы, назірае за расійскім жыццём здалёк, не «варыцца» ў сваім асяроддку, спажывае тое, што далятае з Расіі, пераймае, наследуе, імітуе. Яна маргінальная, рэгіянальная, правінцыйная!

Няшмат у свеце краін, культуры якіх не перашкаджаюць, а дапаўняюць адна другую. Менавіта сярод іх Германія са шматмоўнай Швейцарыяй. Герман Гесэ нарадзіўся і склаўся як пісьменнік у Германіі, другую палову жыцця тварыў у Швейцарыі. Нямецкамоўныя швейцарцы Макс Фрыш і Фрыдрых Дзюрэнмат у Германіі атрымалі прызнанне і першыя літаратурныя прэміі. Такое ўзаемадзеянне магчымае, калі культура кіруецца прынцыпамі гуманізму, а не палітыкай.

Лукашэнка, гуляючы ў аб'яднанне з РФ, прапагандаваў расійскую культуру, каб падкрэсліць Расіі сваю аддансць і набыць эканамічныя ільготы дзеля ўтрымання ўлады.

Але, верагодна, Лукашэнка не прадбачыў, што сваёй палітыкай ён перашкаджае стварэнню нацыянальнай ідэі, спрыяе заняпаду роднай культуры, робіць рэальнай перспектыву стварэння з Бацькаўшчыны шасці правінцыйных губерній РФ.

**Сяргей Я., Мінск**

## Спыніць палітычны пераслед педагогаў

### Заява Прэзідыума Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады).

Кіраўніцтва ўпраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама ў асобе начальніцы ўпраўлення Т. Данілевіч дало ўказанне раённым аддзелам адукацыі Мінскай вобласці і дырэктарам школ вусна ў ультымаўный форме запатрабаваць ад настаўнікаў, якія з'яўляюцца сябрамі апазіцыйных палітычных партый, падаць заявы або аб выхадзе з партый, або аб звальненні з працы па ўласным жаданні. Такія патрабаванні прад'яўлены настаўнікам Уладзіміру Парэйку і Аляксандру Язвінскаму (Нясвіжскі раён), Наталлі Ільініч (Пухавіцкі раён), Сяргею Клімёнку (Вілейскі раён), Надзеі Агафонавай (Любанскі раён), Мікалаю Лешчуну (Лагойскі раён).

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) угледае ў паводзінах Т.Данілевіч і кіраўнікоў раённых аддзелаў адукацыі відавочнае і дэманстратыўнае парушэнне нормаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

У дзеяннях Т. Данілевіч партыя бачыць прыкметы парушэння:

— арт. 4, 5, 33 і 36 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

— арт. 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб палітычных партыях»;

— арт. 14 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

— арт. 45 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб адукацыі»,

— арт. 194 і 199 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з выкладзеным Прэзідыум БСДП

1) выказвае безумоўную салідарнасць з настаўнікамі, якія падвергліся пераследу па палітычных матывах, заклікае дэмакратычную супольнасць Беларусі абараніць іх правы і законныя інтарэсы;

2) заклікае іншых педагогаў да салідарнасці з калегамі;

3) заклікае дырэктароў школ не выконваць незаконныя вусныя патрабаванні Т.Данілевіч;

4) інфармуе аб палітычна матываваным ціску на педагогаў Мінскі офіс Арганізацыі бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе, Сацыялістычную групу ў Еўрапейскім парламенце, братнія сацыял-дэмакратычныя, сацыялістычныя і рабочыя партыі;

5) патрабуе звальнення Т.Данілевіч з пасады начальніцы ўпраўлення адукацыі Мінскага аблвыканкама за грубае парушэнне нормаў прафесійнай і кіраўнічай этыкі;

6) звяртаецца да пракурора Мінскай вобласці з просьбай расследаваць факты дэманстратыўнага парушэння Т. Данілевіч палажэнняў Канстытуцыі і шэрагу законаў Рэспублікі Беларусь і прыняць належныя меры пракурорскага рэагавання.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Серыял, які паставіў на вушы ўсю Расію



**Два тыдні як на Першым расійскім канале пачаўся шматсерыйны фільм «Школа».**

Гэта жорсткая драма, у якой створаны эфект рэалістычнасці сюжэтаў. Вучні п'юць піва на перапынках, паляць, б'юцца, хамяць настаўнікам.

Серыял выклікаў вельмі бурнае абмеркаванне ў расійскім грамадстве. Адны лічаць яго абвостраным адлюстраваннем рэальнай сітуацыі ў школах, што дапаможа прыцягнуць увагу грамадства да іх праблемы. Другія выступаюць за забарону паказу. Расійскія ўлады заявілі, што «такіх перадачаў быць не павінна». З крытыкай выступілі і расійскія настаўнікі, якія лічаць, што ён дыскрэдытуе прафесію, а таксама праваслаўная царква.

Рэжысёрка фільма Валерыя Гай Германіка назвала яго «мізэрным адлюстраваннем таго, што адбываецца».

Сярод падлеткаў фільм атрымаў велізарную папулярнасць. У сацыяльнай сетцы «Вконтакте» фан-група «Школы» складае больш за 10 тысяч чалавек. Падлеткі сталі ідэнтыфікаваць сябе з яго героямі. Серыял «Школа» актыўна вандруе і па беларускіх інтэрнэт-сетках.

**Вольга Жарнасек**

# Памёр казачнік з «Беларусьфільма»

У Маскве 24 студзеня памёр класік дзіцячага кіно Леанід Нячаеў. Сусветную славу яму прынеслі «Прыгоды Бураціна» і казка «Пра Чырвоны Каптурок», знятыя на «Беларусьфільме». Апошні раз Нячаеў наведаў Мінск у красавіку 2009 года з прэм'ерай новай стужкі «Дзюймовачка». Карэспандэнт «НН» **Андрэй Расінскі** тады пагутарыў з рэжысёрам.



**Леанід Нячаеў**

Нар. у 1939 у Маскве. Скончыў «ВГИК». Дэбютаваў у 1974 на «Беларусьфільме» карцінай «Прыгоды ў горадзе, якога няма». Сусветную славу прынеслі «Прыгоды Бураціна» (1975) і казка «Пра Чырвоны Каптурок» (1976) — яны сталі класікай дзіцячага кіно. Зняў таксама «Казку пра Зорнага хлопчыка», «Рудога, шчырага, закаханага», «Пітэра Пэна», фільм «Не пакідай», усяго пад два дзясяткі дзіцячых казак — з іх 13 на «Беларусьфільме».

**«НН»: Цяпер спрабуюць паўтарыць Ваш досвед, зняць такія ж музычныя казкі на «Беларусьфільме». Але не атрымліваецца. Чаму? У чым Ваш сакрэт?**

**ЛН:** А гэта немагчыма. Ёсць сыходны прамень. Ф'ю! Сфакусаваць прамень. Як ён тут, чаму я тут апынуўся — я не ведаю. Мне далі сцэнар пяцісерыйнага прыгодніцкага мультфільма «Прыгоды Бураціна». А я ўзяў і напісаў: «двухсерыйны музычны фільм».

Ёсць разуменне — даяраеш казцы? Давер да казкі, магчымасць стварыць фантастычную рэальнасць — гэта вельмі важны момант. Калі ты ведаеш, што гэта зробіш, — усё ўдасца.

**«НН»: А ці патрэбныя, увогуле, казкі? Вам чатыры гады не давалі грошай на фільм…**

**ЛН:** А перад гэтым я за 17 гадоў на «Беларусьфільме» зняў 13 фільмаў (адзін у Кіеве). За 20 гадоў у Маскве я зняў тры. Мне кажуць: «Мы не робім дзіцячага кіно.»

**«НН»: Дык ці не лепей пад выглядам дзіцячага кіно здымаць гламурныя кліпы з зубадрабільнымі эфектамі?**

**ЛН:** Мы выхаваныя пры сацыялізме. І філасофія наша была ў тым, што мы павінны рабіць высокамастацкае ідэйнае кіно. І «ідэя» ж — не абавязкова камуністычная. Ёсць думка — «дзеля чаго». Навошта? Мне кажуць: «Людзі пруцца глядзець «Гары Потэра». Ну, калі ласка, растлумачце, мне, дурню, у чым тая вялікая ідэя? Гэта — набор трукаў, як кажуць, экшн.

**НН: А ў чым Вашая ідэя? Ідэя Леаніда Нячаева?**

**ЛН:** А мая ідэя… — як гэта паварочваецца язык запытацца, у чым ідэя «Бураціна»? А ў чым ідэя «Шапкі»? А «Прададзенага смеху»?… (Нячаеў хвалюецца і п'е валідол. Ён гаворыць вельмі ціха, але можна разабраць словы песні):

«Кто бы что не говорил там, выход есть у нас пока Из любого лабиринта, из любого тупика. Есть неведомая сила, чтобы нам, беде назло, Всё прощалось и сходило, удавалось и везло...»



# Scorpions завяршае музычную кар'еру

Запланаваны да выхаду на сакавік гэтага года альбом Sting In The Tail будзе апошнім.

Нямецкі рок-гурт Scorpions абвясціў пра завяршэнне кар'еры пасля 40 гадоў існавання. Гурт адправіцца ў развітальнае турнэ па ўсім свеце. Яно пачнецца з канцэртаў у Нямеччыне і працягнецца гады тры.

Балада гурта Wind of Change ў свой час стала помнікам пераменам у Еўропе на мяжы 1980-х і 1990-х, калі крышылася савецкая імперыя.

**Сямён Печанко**

ДЫСКАГРАФІЯ

# WZ і салісты

Мой сябра анёлак, 2009



Вайцюшкевіч вырашыў запісаць альбом з дапамогай новай хвалі «супольнікаў». Сабраць проста дзеля ідэі каманду «Народнага альбома» ўсё больш праблематычна, таму Зміцер паклікаў маладзейшых — Свету Бень і Ганну Хітрык, Алеся Зайцава і Янку Маўзера. Выйшаў альбом лагодных песень, запісаных пераважна пад акустычную гітару пры перыядычным з'яўленні баяна і духавых. Па атмасферы ён блізкі да Вайцюшкевічавай жа «Цацачнай крамы».

Нават самае прыгожае слова, калі яно паўтараецца шматкроць, губляе прывабнасць. У кожнай песні альбома (а іх дванцаць) пяецца пра анёлка ці то ад імя анёлка. Не кожны даслухае да канца. Сярод поспехаў альбома: песня Маўзера «Божая кароўка», «Мара» Алеся Зайцава і выдатная джаз-стылізацыя «Ты, як анёлак» у выкананні Жэні Лятун.

Альбом будзе знакавым для наймалодшага ўдзельніка — Язэпа Вайцюшкевіча, які дэбютаваў у якасці «вакаліста».

Пры ўсёй сімпатыі да матэрыялу, «Цацачная крама» ды «Калыханкі» Вайцюшкевіча былі спялейшымі праектамі пра дзетак і для дзетак. Але такія альбомы ў нас —дэфіцыт. Так што браць «Анёлкаў» усім, па два ў адны рукі.

**Сяргей Будкін**

СЦІСЛА

### Адбор на «Еўрабачанне-2010» пройдзе ў закрытым фармаце

Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Мартыненка. Ёсць некалькі варыянтаў адбору ўдзельнікаў: праз конкурс «ЕўраФэст» або вызначыць артыста можа Белтэлерадыёкампанія. Прадстаўнік Беларусі на «Еўрабачанні» ў Осла вызначыцца на працягу найбліжэйшага месяца.

### Мінкульт думае пра музей Быкава

У Музеі беларускай літаратуры (Багдановіча, 13) адчынілася выстава «Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам». Адным з ініцыятараў стварэння выставы быў міністр культуры Павел Латушка. Міністр не змог прысутнічаць на адкрыцці. Але яго намеснік Тадэвуш Стружэцкі сказаў, што «за гэтай выставай будуць наступныя выставы. Напэўна, будзе задача і магчымасць стварэння і асобнага музея». На адкрыцці выставы прысутнічалі пасы Польшчы і Украіны.

### Мядовая прэмія за «Неўтаймоўны сексафон»

У Пружанах адбылося ўручэнне Мядовай прэміі, якую заснаваў у 2001 годзе прадпрымальнік Мікалай Папека. За 2009 год прэмію (пуд мёду і дыплом) атрымаў баранавіцкі паэт Алесь Корнеў за зборнік вершаў «Неўтаймоўны сексафон». Алесь Корнеў — адзін з самых плённых паэтаў Брэсцкай вобласці. Найбольш ён вядомы любоўнай лірыкай.

### Памёр Эрык Сігал

Аўтар знакамітай аповесці «Гісторыя кахання» («Love Story») амерыканскі пісьменнік і сцэнарыст Эрык Сігал памёр ад сэрца на 73-м годзе жыцця. У 1967 г. Сігал напісаў сцэнар культавага мультыплікацыйнага фільма «Жоўтая падводная лодка» на аднайменную песню легендарнай рок-групы «Бітлз». У 1970 годзе выйшаў яго самы знакаміты твор — «Гісторыя кахання». У тым жа годзе паводле рамана быў зняты аднайменны мастацкі фільм, які атрымаў адразу сем намінацый на «Оскара».

### Мінская бальніца застанецца ў карпусах уніяцкага манастыра XVIII ст.

У бліжэйшы час другая гарадская бальніца Мінска закрыецца на рэканструкцыю. Пасля рамонту медыцынская ўстанова зноў запрацуе ў старых будынках.

Карпусы 2-й гарадской бальніцы Мінска знаходзяцца насупраць Траецкага прадмесця ў будынках XVIII і XIX стагоддзя, у якіх стагоддзі таму існаваў уніяцкі Траецкі манастыр базільянак. Летась сталічныя ўлады агучылі ідэю: перанесці бальніцу ў Паўночны пасёлак, каля Навінак, а шэры і нягеглы будынак бальніцы знесці.

У гістарычных збудаваннях меліся адкрыць гасцініцу і этнаграфічны цэнтр. Цяпер ад ідэі адмовіліся. Паколькі мінскія бальніцы маюць патрэбу ў павелічэнні койка-месцаў, будзе пабудаваны яшчэ адзін шпіталь. Але і 2-я гарадская бальніца не скончыць сваёй працы пасля рэканструкцыі.

**Ягор Марціновіч; КМ, БелаПАН, Віктар Сырыца, rian.ru**

# Краіна Лачплесіса ваюе з крызісам

Чытач «НН» **Андрэй Мычык** праехаў праз Латвію і апісвае ўбачанае. Павучальна!



За памежным КПП Грыгораўшчына—Патарніекі, на першы погляд, тая самая вузкая шаша. Але насамрэч мы ўжо ў Латвіі.

Усходняя яе частка доўгі час уваходзіла ў склад Вялікага Княства Літоўскага. Цягам стагоддзяў тут на роўных жывуць латышы, палякі, расійскія стараверы і нашы браткі-беларусы. Але адчуванне балцкай тоеснасці латышоў выявілася мацнейшым, і ў 1918—1919 гадах народ зрабіў гістарычны выбар на карысць новастворанай дзяржавы — Латвійскай Вольнай Краіны.

Нацыянальная ідэя ўзняла Вольную Краіну з разрухі, стварыла новыя галіны вытворчасці: хімічную, электратэхнічную, аўтамабільную, авіяцыйную... Флагманы латвійскай індустрыі, ВЭФ і РАФ, былі створаны ў тыя часы. Тады ж была пабудаваная Кегумская ГЭС на Даўгаве.

...За вокнамі аўтобуса з'явіўся Даўгаўпілс, па-беларуску Дзвінск, неафіцыйная сталіца Латгаліі. За ім дарога робіцца шырэйшай. Фуры лятуць скрозь імглу па трасе Даўгаўпілс—Рыга. З цемры раз-пораз вынаюць мястэчкі, упрыгожаныя калядным гірляндамі з ліхтарыкаў ды яловых лапак. А леваруч ад шашы нясе цёмныя воды Даўгава. Недзе тут змагаўся і загінуў за незалежнасць Латвіі легендарны Лачплесіс.

### Вольная Рыга

Прывітанне, Рыга! Labrit, Домская плошча, бульвар Свабоды, Рыжскі замак, Ратушная плошча! Апошняй не было ў 1997-м, калі я быў тут апошні раз. Нельга надоўга пакідаць людзей, якіх вы любіце, і мясціны, дзе вам добра. Яны мяняюцца.

Рыга мяняецца толькі ў лепшы бок. Корпусы Політэхнічнага інстытута, узведзеныя за савецкім часам, не пасавалі да Старой Рыгі. Цяпер на іх месцы адноўленая Ратушная плошча з ратушай і будынкамі сярэднявечнага Брацтва Чорнагаловых.

Рыжскаму самакіраванню 785 гадоў. У 1225 годзе Рыга ўвайшла ў Ганзейскі саюз, такі сабе прабобраз цяперашняга Еўрасаюза. З тых часоў Рыга глядзіць на Балтыку, а ўся яе гаспадарка арыентаваная на экспарт.

Жыхары вольнай Рыгі заўжды імкнуліся адстаяць уласныя інтарэсы, мала зважаючы на меркаванне цэнтральнай улады. Вось і на апошніх выбарах у Рыжскую гарадскую Думу перамагла апазіцыйная да ўрада кааліцыя.

### Кааліцыя нацыяналістаў і расійскамоўных

Канфігурацыя ўлады ў Рызе выглядае для беларускага чалавека даволі экзатычна. З аднаго боку, гэта — Цэнтр Згоды, які яднае «расійскамоўныя» партыі і арганізацыі Латвіі, у тым ліку Сацыялістычную, пераемніцу афіцыйна забароненай камуністычнай. З іншага боку, у кааліцыю ўваходзяць Першая партыя Айнарса Шлесерса (лібералы) і Латвійскі Шлях, што трымаецца кансерватыўна-нацыянальнай ідэалогіі.

Слабасць латвійскіх партыяў — яны створаныя пад лідэра. Таму і назвы пазбаўленыя ідэалагічнай афарбоўкі, напрыклад, Новы шлях, Латвійскі Шлях, Першая партыя, Партыя грамадзянаў, Цэнтр Згоды, Народная партыя і г.д. Практычна ўсе партыі залежаць ад буйнога латвійскага капіталу. Ёсць бізнэсмены, здольныя ўтрымліваць адразу некалькі партыяў. У такіх умовах складана правесці рысу паміж палітыкай і карупцыяй.

Латвійская палітычная сістэма адлюстроўвае падзел грамадства на дзве супольнасці: людзей, арыентаваных на заходнія каштоўнасці (пераважна латышы), і людзей, арыентаваных на Крэмль (расійскамоўныя).

Цікава, што заходнікі падзеленыя на шматлікія кааліцыі, тады як усходнікі трымаюцца зацверджаных у Маскве лідэраў, нават калі тыя не бароняць іх інтарэсаў. За Цэнтр Згоды галасуюць малазабяспечаныя расійскамоўныя, хаця яго алігархічны складнік яшчэ больш выразны, чым у празаходніх партыяў.

Толькі 10% «расійскамоўных» падтрымліваюць латышскіх палітыкаў. Адпаведна, 10% латышоў давяраюць прамаскоўскім рухам.

### 900 даляраў — гэта мала

Структура эканомікі Рыгі за гады незалежнасці не зазнала вялікіх зменаў. Калі не лічыць банкруцтва электратэхнічнай галіны, усе старыя гульцы на полі. Стары добры вагонны завод RVR цяпер выпускае электрацягнікі. Атрымала імпульс да развіцця фармацэўтычная кампанія «Олайнфарм». З'явілася новая моцная фармацэўтычная фірма «Грындэкс». Карыстаюцца попытам на еўрапейскіх рынках касметычныя і парфюмерныя вырабы «Дзінтарс». Іншыя рыжскія брэнды таксама адчуваюць сябе няблага. Праўда, некаторыя змянілі імя. Так, рыжскія лакі і фарбы цяпер выпускае фінская «Tikurilla».

Сярэднестатыстычны рыжанін атрымлівае $ 900 штомесяц. Гэта многа ці мала? Для жыхара правінцыі дастаткова. Таму ў дадатак да 850 000 рыжанаў штодзень на працу сюды прыязджае 200 000 «маятнікавых мігрантаў». Але ў ЕС па ўзроўні зарплаты Латвія трэцяя знізу. Ніжэйшыя заробкі толькі ў Балгарыі з Румыніяй. Таму моладзь выбіраецца на заробкі ў Брытанію або Ірландыю.

### Стаўка вялікага магістра

Аўтастрада выгнула спіну ўздоўж ракі Гаўя. Тут, на лясістых узгорках вобласці Відзэмэ, знаходзіўся цэнтр улады Лівонскага Ордэна.

Мястэчка Сігулда — рэзідэнцыя комтура сярэднявечнай Лівоніі. Тут праводзілі свае пасяджэнні ландтагі (тагачасныя парламенты).

Горад Цэсіс за 90 кіламетраў на паўночны ўсход ад Рыгі — рэзідэнцыя выканаўчай улады Лівонскага Ордэна. З Цэсіскага замка кіравалі жалезнай рукой вялікія магістры. Цяпер сон старажытнай «прэзідэнтуры» трывожаць толькі мітуслівыя турысты.

На цэнтральнай плошчы горада знаходзіцца іншы важны помнік — мемарыял у гонар перамогі аб'яднанай латышска-эстонскай арміі над немцамі ў 1919 г. З гэтага моманту пачынаецца жыццё Латвійскай Вольнай Краіны дэ-факта.

Тут няма буйной прамысловасці. Калісьці штат піўзавода «Цэсу алус» складаў 800 чалавек. Фінскі інвестар паставіў сучаснае абсталяванне, і ў выніку калектыў скараціўся да 80 чалавек. 17% жыхароў Цэсіса працуе на прадпрыемствах Рыгі.

Але на прыкладзе такіх невялічкіх мястэчак (у Цэсісе 18 тысяч жыхароў) можна пазнаёміцца са становішчам у жыллёвай гаспадарцы Латвіі.

### Набралі крэдытаў на вілы

Пераважная большасць людзей прыватызавала сваё жытло за чэкі (у Латвіі — сертыфікаты). Выключэнне было зроблена толькі для дэнацыяналізаванага жыллёвага фонду. Бо Вярхоўны Савет Латвійскай ССР, абвяшчаючы незалежнасць, вярнуў законную сілу праўным актам Вольнай Краіны.

У Цэсісе пасярод горада стаіць занядбаны палац. Нашчадак былога ўласніка аднавіў свае правы на гэты аб'ект. Але вяртацца з ЗША не захацеў. Толькі плаціць падаткі ў бюджэт горада. Дом паступова разбураецца. І ніхто не мае права пальцам яго крануць. Толькі змрочныя аканіцы ўпрыгожваюць фота ўсмешлівых юнакоў і дзяўчат — каралеваў і каралёў, якіх штогод абіраюць на Дні горада.

Ёсць у Цэсісе і іншыя дамы: прыгожыя двухпавярховыя вілы пад стылёвай дахоўкай. На адным, другім, трэцім, дзясятым — вялізныя плакаты «Pardod» (прадаецца). Напярэдадні крызісу тутэйшы люд актыўна браў крэдыты ў банках. Цяпер запазычанасць складае $12,5 млрд на два з паловай мільёны чалавек. Банкі не ведаюць, што рабіць з нерухомасцю, якая ім дастаецца за нявыплаты, а ўрад ратуе банкі. Дарэчы, доўг урада удвая меншы, складае «толькі» $ 5,6 млрд.

Латвійскі ўрад ратуе не толькі банкі. Калі ў чалавека адна кватэра, ён у ёй жыве, але яна закладзеная, і кошт крэдыту не перавышае $100 000, урад можа разлічыцца па абавязацельствах даўжніка перад банкам, запісваючы грошы ў доўг урада з растэрміноўкай на дзесяць гадоў.

### Дзяржава выкупляе пазыкі

Паўстаюць праблемы і з аплатай камунальных паслуг. У Цэсісе яны асабліва дарагія. У савецкі час, калі ніхто не лічыў грошы, у горадзе пабудавалі цеплаэлектрастанцыю. Цяпер цэсіская трохпакаёўка цягне ў ацяпляльны сезон камунальных паслуг на $200 штомесяц. Гарадское самакіраванне купляе блакітнае паліва для электрастанцыі ў нямецкага пастаўшчыка («Рургаз») на ўмовах перадаплаты за 10 дзён.

Паводле латвійскіх законаў, улады не маюць права адключыць фізічнай асобе ваду і цяпло ў ацяпляльны сезон. Самакіраванне зацікаўленае, каб жыхары самі аплачвалі камунальныя паслугі. Для гэтага бедным выдзяляецца субсідыя. Мяжа беднасці ў Латвіі — 180 даляраў у месяц для адзінокага чалавека і 240 даляраў на сям'ю.

У Цэсісе (казус уласнай электрастанцыі) узровень беднасці вышэйшы: адпаведна 216 і 276 даляраў. Калі чалавек або сям'я апускаецца да гэтай мяжы, самакіраванне выдзяляе ім разавую дапамогу — 480 даляраў. Права на дапамогу маюць і гаспадары прыватных дамоў. На дровы.

Калі запазычанасць перад самакіраваннем усё адно складае два месяцы і болей, улада мае права перасяліць чалавека ў камунальнае жытло. У Цэсісе да крызісу пабудавалі два камунальныя пяціпавярховікі. Цеплаізаляцыя, шклопакеты, усё паводле сучасных еўрастандартаў. Адзінае, што адрознівае ад звычайнага дома, — планіроўка. У доме адзін пад'езд і па адным калідоры на паверх. Як у інтэрнаце.

Усе віды сацыяльнай дапамогі ў Латвіі налічваюцца ў працэнтах ад мінімальнага заробку, які складае 360 даляраў.

### Плюсы і мінусы Латвіі

Эканамічны плюс Латвіі — прыватызацыя адбылася.

Эканамічны мінус — Латвія пайшла шляхам большасці постсацыялістычных краінаў.

Тут, як і ў Расіі, ёсць невялікая група людзей, што аб'ядналі ў сваіх руках эканамічныя і палітычныя рэсурсы (алігархі). Таму ёсць вялікія дыспрапорцыі ў размеркаванні прыбыткаў.

А стратэгічны выклік латвійскім палітыкам сёння — зрабіць так, каб людзям Латвіі не хацелася пакідаць родны кут у пошуках працы. Каб працоўных рук і разумных галоў тут хапала і цяпер, і ў будучыні. Таму нават ва ўмовах жорсткай эканоміі бюджэтных рэсурсаў кожная сям'я з дзецьмі атрымлівае штомесяц ад дзяржавы 50 латаў дапамогі (болей за сто даляраў). Рыжская Дума віншуе бацькоў з нараджэннем рыжаніна «прызам» у 1000 даляраў.

У першы год дэкрэтнага адпачынку жанчына атрымлівае 75% заробку па апошнім месцы працы. Жанчына пазбаўленая дадатковых стрэсаў наконт уцёкаў бацькі-аліментшчыка. Дзяржаўны фонд у такіх выпадках бярэ на сябе клопат па ўтрыманні сям'і. Наша дзяржава думае, як адпомсціць нядбайным бацькам: забраць грошы, уладкаваць на хімію. Латвійская ж думае пра інтарэсы наступнага пакалення.

# Мой яўрэйскі сябар Міша

Апавяданне. **Зоя С.**

Андрэю было чатырнаццаць гадоў, калі яго бацькі пераехалі на сталае жыццё ў Мінск. Бацька — вайсковец, таму сям'я шмат паездзіла па Саюзе. Ён быў украінец, але чамусьці Украіну не любіў. У Мінск жа закахаўся пасля ўдзелу ў вайсковых спартыўных спаборніцтвах. А ўсё таму, што большая частка «спаборніцтваў» прайшла ў мінскіх рэстаранах.

І вось Андрэй пайшоў у восьмы клас звычайнай мінскай школы. Яго пасадзілі за адну парту з Мішам. Міша быў яўрэй. Худзенькі руды кучаравы хлапчук. Яму часта перападала ад аднакласнікаў, але не таму, што яўрэй, а таму, што худзенькі. У школе так прынята: хто мацнейшы, таго і праўда.

Але і Міша не здаваўся. У першы дзень знаёмства з новым аднакласнікам ён залез локцем на палову парты Андрэя і пачаў патроху выпіхваць, каб паказаць, хто тут галоўны. Праз тыдзень Андрэй разлінаваў крэйдай напалам парту і забараніў Мішу пераходзіць мяжу, інакш будзе біць. Тады яны пасябравалі. Сын вайскоўца і сын прафесара, украінец і яўрэй.

Міша вучыўся так сабе. Бацькі ўшчувалі: «Які сорам, каб яўрэйскі хлопчык ды кепска вучыўся». Але Міша не здаваўся. Ганяў мячык у двары, замест таго каб засесці за падручнікі. Пад канец школы бацька махнуў на яго рукой, сказаўшы: «Усё дарэмна. У ВНУ ты не паступіш». І вельмі гэтым Мішу раззлаваў. Міхаіл апантана засеў за падручнікі і дзіва адбылося. Ён стаў студэнтам.

Але натура ўзяла сваё. Вучыўся дрэнна. Пасля заявіў бацькам, што выбраў не той інстытут і вучобу кідае. Цярпенне бацькі лопнула, і ён папрасіў сына пакінуць разам з інстытутам і кватэру.

Але пераехаць на суседнюю мінскую вуліцу ў зняты пакой — гэта так банальна. Міша вырашыў ехаць у Сібір. Адыходную гулялі ў прывакзальным рэстаране. За тры гадзіны да адпраўкі цягніка яны пачалі банкет. Сябры спрабавалі Мішу спыніць. «Я вам не падлетак», — адказваў ён і куляў чарку за чаркай. Праз падземны пераход Міша прайшоў хістаючыся, а на пероне — лёг. Хлопцы падхапілі яго пад рукі і пацягнулі да вагона. Праваднiца кінула пагрозлівы позірк: «Вашы білеты?» Хлопцы паказалі адзінокі пакамечаны квіток. «Хто пасажыр?» — тым ка тонам спытала яна. Кіўнулі на Мішу. «Заносьце. Білет будзе ў мяне». Цела занеслі ў купэ і размясцілі на верхняй паліцы. Туды закінулі і чамадан...

Прачнуўся Міша ўжо за Масквой і жахнуўся. Дзе ён? Ланцужок успамінаў прывёў яго ў прывакзальны рэстаран: «А! Напіўся! — радасна падумаў ён. — Нічога страшнага, еду ў Сібір!»

Праз год Міша вярнуўся ў Мінск. Сібір яму не спадабалася. Заслалі на працу ў нейкую пустэльню. 200 км ад бліжэйшага жылля, машкара кусаецца. «Я тут падумаў: можа, паступіць у інстытут?» — казаў Міша. І яшчэ раз паступіў у інстытут. Бацькі былі задаволеныя. Але іх чакаў новы сюрпрыз. Сын прывёў маладую жонку-беларуску. «Бацькі хацелі, каб я ажаніўся з яўрэйкай, а я ажаніўся па каханні», — скажа пасля Міша. Другі інстытут ён таксама не скончыў, але ўладкаваўся працаваць у навукова-даследчай установе, далей ад рыдлёўкі і ўспамінаў пра Сібір.

Сямейнае Мішава жыццё было бурлівым. Ён любіў кампанію, спевы пад гітару з сябрамі і сяброўкамі. На гэтую тэму былі разборкі з жонкай, біццё посуду і кіданне табурэтак. За падзеямі назіралі спалоханыя яўрэйскія бацькі. Але што зробіш — Міша кахаў. Не забываў ён і свайго школьнага сябра. Аднойчы, у студэнцкія гады, завітаў да Андрэя ў госці. За сяброўскай размовай Міша раптам сказаў: «Ведаеш, у Леніна быў сіфіліс...» Сябра анямеў ад нечаканасці. «Я не доктар, яго не правяраў, але цалкам верагодна», — сціпла дадаў Міша. І гэта ў сацыялістычна-камуністычнай Беларусі!

У краіне пачынаецца «перабудова». Можна здзейсніць векавую яўрэйскую мару — пакінуць Савецкі Саюз. Бацькі зазбіраліся ў Амерыку. А Міша не хоча, ды і жонку-беларуску не адпускаюць сваякі. Бацькі з'ехалі з малодшай дачкой. Сын уздыхнуў на поўныя грудзі. Вясёлыя кампаніі пачалі збірацца ўжо ў Мішы дома. Гулянкі, спевы пад гітару, п'янкі з сябрамі, начлегі закаханых пар — вось яна, сапраўдная свабода. Жонка разгул трохі прыціскала, але і сама любіла вясёлую кампанію. Яны былі маладыя, дзяцей не было.

Андрэй таксама бываў запрошаны на вечарынкі. У той час ён ужо ажаніўся і меў маленькага сына. Сына трэба было хрысціць. Лепшага хроснага бацькі за Мішу не было. Але перш, чым хрысціць дзіця, трэба хрысціцца самім. Яны пайшлі ў царкву да бацюшкі:

— Скажыце, ці можна пахрысціцца двум чалавекам: украінцу — сыну вайскоўца, і яўрэю — сыну прафесара?

— Калі ласка, было б жаданне, — адказаў бацюшка.

Святар іх пахрысціў, даў наказ, каб часцей наведвалі царкву. Схадзілі яны туды адзін раз: ахрысціць малога. Так і засталіся праваслаўнымі атэістамі.

Жыццё ішло. Міша пачаў думаць: «Што за Амерыка такая, можа, з'ездзіць?» Дый бацькі ўвесь час клікалі . Міша пагаварыў з жонкай і палюбоўна аформіў развод. Жонка паехала б з ім, бо кахала свайго Мішу, але яе бацькі не давалі дазволу на выезд. Абняліся, паплакалі, развіталіся. Міша паляцеў насустрач новым прыгодам. А жонцы ў спадчыну ад яўрэйскай сям'і засталася трохпакаёвая кватэра.

Прыляцеўшы ў Амерыку, наш герой крыху разгубіўся. Усё чужое, нязвыклае. Пасяліўся ў бацькоў. Але доўга не вытрымаў, бо прывык да вольнага жыцця. Як толькі ўладкаваўся на працу, зняў асобнае жыллё. Арганізаваў там маленькі Мінск у Амерыцы. Хутка з'явіліся новыя сябры, эмігранты з былога Саюза. Пакаціла зноў вясёлае жыццё: гулянкі, вечарынкі, спевы пад гітару. І вось да Беларусі даляцела вестка: Міша сядзіць у амерыканскай турме за арганізацыю прытона. Тое, што ў Мінску называлася ўсяго толькі вясёлай кватэркай, у Амерыцы пацягнула на прытон. Адсядзеўшы паўтара года, Міша на Амерыку пакрыўдзіўся: «На чорта мне іх амерыканскае грамадзянства. Я беларусам нарадзіўся, беларусам і памру!» І, назбіраўшы грошай, паляцеў у Мінск.

У аэрапорце яго сустракалі старыя сябры на машыне «Масквіч» з гітарай і вясёлай кампаніяй. Міша выйшаў да іх з невялікім чамаданам, усё ў тых жа знаёмых, крыху стаптаных пантофлях. Заціснуўшыся ўпяцёх на задняе сядзенне, яны душылі яго ў абдымках і цiскалі. Дасталі гітару, пачалі гарланіць вясёлыя песні. Міша сядзеў нейкі прыбіты. Калі на паўдарозе сябры выцягнулі бутэльку і сказалі «налівай», Міша спалохана залямантаваў: «Не трэба, міліцыя можа арыштаваць!» Давала знаць амерыканскае мінулае. Паехалі да былой жонкі-беларускі і там адзначылі сустрэчу. Міша як убачыў сыравэнджаную кілбасу, пачаў умінаць бутэрброд за бутэрбродам.

Пагасцяваўшы у Беларусі месяц, Міша вярнуўся ў Амерыку і знік з поля зроку на некалькі гадоў. Зрэдку званіў былой жонцы, пытаўся пра жыццё ў Беларусі: «Па амерыканскім тэлебачанні перадаюць, што ў вас голад і хаос. Я вельмі хвалююся...» Забастоўкі, грашовыя рэформы, голыя паліцы, палітычныя катаклізмы, войны ў Расіі — з Амерыкі гэта здавалася асабліва жахлівым. Але з часам жыццё ўвайшло ў нармальную каляіну.

Аднойчы ў кватэры Андрэя зазваніў тэлефон: «Прывітанне, гэта Міша. Хутка буду ў Мінску. Я пастарэў, але ўсё той жа, убачымся». Сябры таксама пастарэлі, сталі сур'ёзнымі сямейнымі людзьмі, але па старой памяці ўсчынілі вэрхал з нагоды Мішавага прыезду ў былой кватэры яго бацькоў. На вечарынку Міша з'явіўся з сяброўкай. За тры дні ў Мінску ён знайшоў даму сэрца, выкладчыцу англійскай мовы. І культурна па-англійску пудрыў ёй мазгі. Збылася мара бацькі-прафесара: сын культурны і размаўляе па-англійску. Аднак пад канец вечара Мішу панесла. Ён прынёс у тазіку дадатковую порцыю салата аліўе. Паставіў пасярод стала, сказаўшы: «Частуйцеся, гэта вам». Пасля лёг на канапу і заснуў. Госці працягвалі банкет самастойна. Дама сэрца пакрыўджана падціснула вусны, а праз некаторы час сышла, бразнуўшы дзвярыма.

Праспаўшыся, Міша пазваніў Андрэю і таямнічым голасам паведаміў: «Да мяне з Амерыкі прыедзе Лена. Сустрэнемся ў рэстаране. Прыходзь з жонкай». Вечарам у рэстаране яны чакалі Лену. Увайшла худзенькая някідкая жанчына. Міша нейкім асаблівым голасам сказаў: «Гэта Лена». Сябар зразумеў — усё сур'ёзна. Трэба трымаць язык за зубамі. І пачаліся размовы, як яны вучыліся ў інстытутах, добра сябе паводзілі, былі амаль выдатнікамі (Лена на выдатна скончыла ВНУ ў Ленінградзе), удзельнічалі ў грамадскім жыцці і пераводзілі бабулек праз дарогу. Лена засталася цалкам задаволеная. Вечар удаўся. У кулуарах Міша сябру шэптам паведаміў :

— Збіраюся жаніцца. Адключыў усе мабільныя тэлефоны.

— Даўно пара! Ужо за 40 гадоў. Хроснаму сыну 16.

Міша пафарбаваў свае рудыя валасы ў белы колер. У сорак гадоў стаў бландзінам. Лена «хлопца» ацаніла і дала згоду. Нявесце было 36. Праз год з Амерыкі даляцелі навіны. Міша стаў бацькам. Сядзіць дома з сынам. Узяў дэкрэтны, а жонку адправіў на працу. Праз год — яшчэ адзін сын, і зноў Міша ў дэкрэце. Любіць ён арыгінальнае рашэнне праблем. Дарэчы, запрасіў свайго сябра-музыку падзарабіць у Амерыцы. Той з'ездзіў. Працаваў два гады. Вярнуўся і сказаў: «Не ведаю, як Міша можа там жыць?! Амерыканскае жыццё — проста жах!» А Міша не здаецца. Купіў з жонкай дом у крэдыт, абсталёўваюць. Пасярод залы стаіць белы раяль.

— Міша, ты ўмееш іграць на раялі?!

— Не, не ўмею. Але ў мяне ў дзяцінстве была мара, я хацеў мець белы раяль.

Збылася мара яўрэйскага хлопчыка: Амерыка, свой дом і белы раяль. Але Міша ўсё адно звоніць у Беларусь і пытаецца; «Як там, у нас на радзіме?»

## КЛАСІКА

### НІНА МАЦЯШ

СЯБРЫНЕ

Не знадзейвайся. Пераживі.
Хоць якая, ды ёсць патоля:
Намарозіць радня па крыві —
Адагрэе радня па долі.

Скруха — зашмаргай... Перарві.
Ёсць лагода на боль, на скруху:
Адрачэцца радня па крыві —
Паратуе радня па духу.

Праўду гэту — як ёсць — прыві
Да сцяжыны далейшага руху.
Будзь здарова, радня па крыві.
Будзь бясcмертна, радня па духу!

**Ніна Мацяш** (1943—2008)

вырасла на Бярозаўшчыне, жыла ў Белаазёрску. Інвалід з дзяцінства, была чалавекам рэдка светліні і грамадзянскай сілы.






## ІМПРЭЗЫ

**Вечарына Леаніда Дайнекі**

Творчая вечарына з нагоды 70-годдзя пісьменніка Леаніда Дайнекі пройдзе **29 студзеня ў касцёле Святых Сымона і Алены.** Бяруць удзел пісьменнікі Васіль Зуёнак, Сяргей Законнікаў,



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Эдуард Акулін, Леанід Дранько-Майсюк. Уздымаць святочны настрой гасцям і юбіляру будуць музыкі: **Зміцер Вайцюшкевіч, Алесь Камоцкі, Таццяна Беланогая,** а таксама гурт **«Стары Ольса»** і ансамбль народнай музыкі **«Свята». Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

**Сцебурака і Кустава ў Гістарычнай майстэрні**

Паэты Валярына Кустава і Усевалад Сцебурака выступяць **у мінскай Гістарычнай майстэрні (вул. Сухая, 25)** па запрашэнні Клуба традыцыйны перад былымі вязнямі гета і канцлагераў **28 студзеня. Пачатак а 13-й.** Уваход вольны.

**Свята вышыванкі**

**28 студзеня а 16-й у Музеі гісторыі літаратуры (вул.Багдановіча, 15)** — свята вышыванкі.

## КАНЦЭРТЫ

**Алесь Камоцкі**

**30 студзеня на Малой сцэне Купалаўскага тэатра а 19-й** — канцэрт Алеся Камоцкага.



**Крама**

**3 лютага а 19-й у «Рэактары» (вул.Харужай, 29)** — канцэрт рок-гурта «Крама».




**Вечарына «Дударскага клуба»**

**27 студзеня ў клубе «Бастыён» (вул.Валгаградская, 35)** — вечарына «Дударскага клуба». Бяруць удзел **Galiarda,** асобныя дудары і музыкі **«Старога Ольсы», Testamentum Terrae, «Келіх кола».**

**«Купала/Караткевіч»**

Акустычны канцэрт пад назвай «Купала/Караткевіч» пройдзе **ў Наваполацку 29 студзеня.** Песні на словы класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Уладзіміра Караткевіча праспяваюць барды **Раман Яраш і Андрэй Касцень. Канцэрт распачнецца ў 17.30 у бібліятэцы-філіяле №1 імя Якуба Коласа (вул. Маладзёжная, 104).**

**Бардаўскі хрысціянскі хіт**

**28 студзеня ў касцёле Св.Сымона і Алены ў Мінску** адбудзецца канцэрт-прэзентацыя складанкі бардаўскіх спеваў «Бардаўскі хрысціянскі хіт». Удзел у канцэрце возьмуць **Кася Камоцкая, Эдуард Акулін, Алеся Унукоўская, Таццяна Беланогая, Алесь Камоцкі, Марыя Новікава, Андрэй Плясанаў, Алесь Наркевіч** і іншыя. **Пачатак у 18.30.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Жылі-былі...**

**Ад 10 лютага да 7 сакавіка ў музеі Акадэміі мастацтваў (вул.Сурганава, 14а)** будзе працаваць выстава сучаснай дзіцячай кніжнай ілюстрацыі з Беларусі, Германіі, Ізраіля і Польшчы. Дыяпазон прадстаўленых на выставе тэхнік вельмі шырокі: ад акварэльных работ да шаўкаграфіі, ад гуашы і пастэлі да выразкі нажом на пергаміне, ад малюнка пяром да калажа і эксперыментальных лічбавых формаў.

**Багдановіч з пуху дзьмухаўцоў**

**У філіяле гістарычнага музея «Дом-музей І з'езда РСДРП» да 24 лютага** працуе выстава карцін з пуху Соф'і Лях. Тут можна ўбачыць партрэты беларускіх асветнікаў Ф. Скарыны, Еўфрасінні Полацкай, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Цёткі, У. Караткевіча, У. Мулявіна, Р. Барадуліна, створаныя з пуху дзьмухаўцоў.

**Юдаль Пэн**

**У Гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** праходзіць выстава карцін Юдаля Пэна. 33 працы са збораў Віцебскага краязнаўчага музея ў Мінску экспануюцца ўпершыню. **Выстава працуе да 28 лютага.**

**Найлепшае з Цэслера і Войчанкі ў Магілёве**

**У Музеі В.Бялыніцкага-Бірулі (Магілёў) да 28 сакавіка** працуе выстава The best of V. Tsesler & S. Voichenko. У экспазіцыі прадстаўленыя творы Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі са збораў Нацыянальнага мастацкага музея.

**Светлае Свята Раства**

**У Гістарычным музеі да 14 лютага** працуе мастацкая выстава Валянціны Шоба «Светлае Свята Раства».

**Выстава адной карціны**

**Да 6 лютага ў Мастацкім музеі (вул. Леніна, 20)** у рамках праекта «Выстава адной карціны» экспануецца палатно Івана Айвазоўскага «Ноч на востраве Родас».

**Васіль Сумараў і вучні**

**У Мастацкім музеі да 15 лютага** працуе выстава «Васіль Сумараў. Настаўнік і вучні».

**Міжнародны фестываль пейзажу**

**У галерэях «Ракурс» і «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі да 11 лютага** працуе IV Міжнародны фестываль пейзажу, прысвечаны Віталю Цвірку.

## ТЭАТРЫ

**28 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі?..»
**Тэатр оперы і балета** — «Чароўная флейта»
**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»

**29 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Халоднае сэрца»
**Тэатр імя Горкага** — «Нінычка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»

**30 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр імя Горкага** — «Легенда пра беднага д'ябла»
**Купалаўскі тэатр** — «ГендэльБах»
**Тэатр оперы і балета** — «Багема»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

**31 студзеня**

**Тэатр лялек** — «Піпі Доўгаяпанчоха»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Тэатр оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

**2 лютага**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр оперы і балета** — «Князь Ігар»

**3 лютага**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

**4 лютага**

**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»

**5 лютага**

**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»

**6 лютага**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Воўк-мараплавец»
**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жанчыны Бергмана»
**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»

**7 лютага**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Тэатр оперы і балета** — «Дон Кіхот»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»

## КІНО

### Казань з кулакамі

**Кніга Ілая** (The Book of Eli)

ЗША, 2010, каляровы, 117 хв.

**Рэжысёры:** Альберт Х'юз, Ален Х'юз

**Жанр:** Постапакаліпсічны баявік

**Адзнака:** 6,5 (з 10)




Пасля вайны і катастрофы па выпаленай зямлі ідзе на Захад самотны вандроўнік. Ён мусіць данесці да людзей забытую Кнігу. Але людзі здзічэлі, дарогі небяспечныя. А галоўны мясцовы нягоднік палюе на Кнігу — дзеля большай улады...

Фільм братоў Х'юз — асцярожная казань, замаскаваная пад постапакаліптычны баявік. Кніга, як вы ўжо здагадаліся, — Біблія. А казань разгортваецца ў коміксна-попельным свеце. У гэтым свеце — хеўры байкераў, канібалы, дзікія каты, барацьба за ваду. Нацягнуты лук, старыя машыны, лязо нажа і бойкі — як спектаклі ў тэатры ценяў.

Самая важная інтрыга — праўда забароненай Кнігі. У спаленым свеце нечакана гучаць словы малітвы. Няма пэўнасці, што тыя словы пачуты. Але сама спроба падобнае кантрабанды цікавая. І быццам бы нетлумачальныя навароты сюжэта — надзвычай празрыстыя.

**Андрэй Расінскі**

# Адпачынак маладых арыстакратаў

Спорт — не толькі барацьба за рэкорды, але і атрыбут раскошнага жыцця.

Віды спорту, якія звычайна адносяць да элітных, развітыя ў Беларусі слаба. Большасць з іх адносіцца да індывідуальных і патрабуе вялікіх укладанняў. Зрэшты, таму яны і лічацца арыстакратычнымі.

### Гульня бізнэсоўцаў

Ідэальна падстрыжаныя зялёныя палі, беласнежны мячык і клюшка — гэта гольф. Адна з самых дарагіх, і таму самых прэстыжных гульняў у свеце. Гольф унесены ў спіс абавязковых дысцыплін у найлепшых універсітэтах свету. Падчас гульняў часта праходзяць бізнэс-перамовы, карткі сяброў гольф-клубаў каштуюць дзясяткі тысяч даляраў. А самы багаты спартсмен свету Тайгер Вудс зарабіў свой мільярд, дзякуючы менавіта гольфу.

Аддаць дзіцёнка ў Акадэмію гольфа пакуль немагчыма, бо ў Беларусі такіх устаноў няма. Тая ж сітуацыя і з палямі... Увогуле колькасць гульцоў не перавышае дзясятка чалавек.

Першы ў краіне гольф-клуб будуецца непадалёк ад Мінска, пад Калодзішчамі. Кошт двух палёў ацэньваецца ў $15 мільёнаў. Каля іх павінен адкрыцца і цэнтр навучання. Цэны на трэніроўкі невядомыя, але, напрыклад, у Маскве паўтары гадзіны з інструктарам каштуюць $100.

У 2016 годзе гольф з'явіцца ў праграме Летняй Алімпіяды. Навучыцца за гэты час гульні цалкам магчыма.

### Незагнаныя коні

Конны спорт падыходзіць Беларусі нашмат больш. На бяскрайніх палях не будзе праблем для трэніровак. Найбуйнейшы ў Беларусі конны цэнтр знаходзіцца ў Ратамцы, за некалькі кіламетраў на захад ад сталіцы. Збіраюцца там будаваць і іпадром — вось толькі знайсці б інвестара на $160 мільёнаў.

Асноўныя ўкладанні для тых, хто вырашыць заняцца гэтым відам спорту, — пакупка каня, які каштуе ад тысячы да мільёна даляраў у залежнасці ад радаводу. Яго ўтрыманне ў належных умовах — яшчэ мінімум $200 у месяц. Патрэбная яшчэ экіпіроўка для вершніка. Мінімальны набор — тысяча даляраў.

На леташняй Алімпіядзе найлепшай з беларусак стала Ірына Ліс. Вярхом на Рэдфардзе яна ўзяла толькі 30-е месца. Конь той, дарэчы, каштуе мільён даляраў. Даражэй за самы дарагі аўтамабіль.

### Навыперадкі з ветрам

Рассякаць ваду на Мінскім моры пачалі 50 гадоў таму. Цяпер для ахвотных займацца ветразевым спортам працуюць спецыялізаваныя дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву і цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі.

Далучыцца да кампаніі алігархаў на яхтах за дзясяткі мільёнаў даляраў можна і без пастаянных заняткаў спортам. У Беларусі ёсць магчымасць прайсці курс навучання і атрымаць сертыфікат на кіраванне яхтай.



### Тут вам не Іспанія

Адзін з самых высокааплатных відаў спорту — тэніс. Але на алтар поспеху дзіцяці бацькі павінны пакласці ўсе свае сілы. Чэмпіёны вялікага тэніса рыхтуюцца ў спецыялізаваных школах і акадэміях у Іспаніі ці ЗША. Атрымаць добрую тэнісную адукацыю ў Мінску можна. Ды славутыя беларускія спартсмены — Вікторыя Азаранка і Максім Мірны — з дзяцінства вучыліся за мяжой.

Але не ўсім жа станавіцца чэмпіёнамі! Навучыцца гуляць можна і ў Мінску. Арэнда корта каштуе ад 20 да 50 тысяч рублёў за гадзіну. Іх колькасць ужо ідзе на дзясяткі. Ёсць і ў сталіцы, і ў Лагойску. Прафесійная ракетка — ад $150.

### Гульні эканом-класа

Спалучэнне фізпадрыхтоўкі і развіццё інтэлектуальных здольнасцяў дае більярд. Ён ужо набліжаецца да агульнадаступных відаў спорту. Арэнда стала каштуе каля 10 тысяч рублёў за гадзіну. Урокі гульні ў прафесіянала абыдуцца ў 30 тысяч за гадзіну.

Шахматы даюць інтэлектуальную падрыхтоўку. Гурткі — звычайна бясплатныя — пры кожным доме культуры і ў многіх школах — ператварылі гульню ў народную.

Сябраваць са спортам становіцца модна. Футбол і валейбол адкрыты кожнаму, а вось больш экзатычныя віды спорту дапамагаюць вылучыцца сярод іншых. Гэта тая сітуацыя, калі можна ганарыцца нават уменнем проста гуляць.

**Ягор Марціновіч**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Грэнкі з сырам (д'яблоткі)

1 французская булка, 100 г швейцарскага сыру (найбольш падобны да яго ў цяперашняй Беларусі — сыр «Радзівіл» вытворчасці Бярозаўскага завода; пасуюць да грэнкаў і іншыя цвёрдыя сыры, а асабліва — пармезан), 1—2 жаўткі, 1 лыжка масла.

Французскую булку са зрэзанай скарынкай пакроіць тонкімі палоскамі. Змяшаць цёрты швейцарскі сыр або пармезан з маслам і жаўткамі, намазаць гэтую масу на палоскі булкі. Так прыгатаваныя грэнкі паставіць у печ на 5—10 мінут, каб падпякліся. Падаваць да мясных супоў.

**З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858, пераклала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**СПАЧУВАННІ**

**Светлане Алексіевіч выказваем** спачуванне з нагоды вялікага гора — смерці бацькі. Калегі, сябры.

**ШУКАЮ**

**Сяброў па перапісцы**, якія цікавяцца хрысціянскімі каштоўнасцямі, хрысціянскім ладам сямейнага жыцця (бо я пакуль адзін), а таксама гісторыяй Беларусі. Мне 34 гады. А/с 49, 210023, Віцебск.

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашаем** у падарожжа 14 лютага па маршруце: Мінск—Германішкі—Воранава—Воранаўка—Жырмуны—Восава—Пагародна—Радунь—Нача—Пеляса—Мінск. Т.: 262-73-43, (029) 111-73-32.

**НАБОР ВАЛАНЦЁРАЎ**

**ГДА «Гродзенскі дзіцячы хоспіс»** абвяшчае набор кандыдатаў для ўдзелу ў адукацыйных трэнінгах «Валанцёр — чалавек добрай волі». Наступная сустрэча — 28 лютага. Даведкі: e-mail: pallpom@gmail.com, skype: gushtyn, т.: (29) 588-17-41, (25) 972-37-64 (Life).

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ



## Каб абутак доўга жыў

Ці доўга пратрымаюцца вашы любімыя туфлі? Простыя правілы дагляду, з разлікам на абарону ад вулічнай солі.

Сушыць абутак трэба пры пакаёвай тэмпературы, не ставіць яго пад батарэю або радыятар, бо скура перасыхае і можа патрэскацца.

Час ад часу апрацоўвайце туфлі спецыяльным супрацьгрыбковым спрэем (прадаецца ў супермаркетах і аптэках).

Калі пасля прагулкі зімой на абутку засталася соль, спачатку трэба высушыць боты, а потым соль сцерці сухой шчоткай. Толькі пасля гэтага можна наносіць крэмы і іншыя сродкі.

**Наста Шамрэй**

ЗДАРОЎЕ

## У большасці «алергікаў» ніякай алергіі няма

Як паказала даследаванне, праведзенае ў Портсмуцкім універсітэце (Вялікабрытанія), пятая частка дарослых людзей мяркуе, што ў іх алергія на той ці іншы харчовы прадукт. Аднак пры клінічным абследаванні гэты дыягназ выяўляецца не больш чым у кожнага пяцідзесятага з іх. Жанчыны памыляюцца часцей за мужчын, і часта неабгрунтавана лічаць алергікамі сваіх дзяцей, і пазбаўляюць іх карысных прадуктаў.

Людзі памыляюцца, бо вераць пашыраным стэрэатыпам пра алергіі, якія ў апошнія дзесяцігоддзі сталі «модным дыягназам». Чым самому вызначаць хваробу, лепей звярнуцца да спецыяліста-медыка. Бо неабгрунтаваная адмова ад тых ці іншых прадуктаў можа выклікаць у аматараў самадыягностыкі і іх дзяцей дэфіцыт шэрагу вітамінаў, антыаксідантаў, харчовых валокнаў.

**НШ**



## Газетка дзеткам



Люлі-люлі-люлі,
Прыляцелі гулі.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі сакатаці
Чаго гулям даці?
Ці ячменю жменю?

Ці жыта карыта?
Ці бобу каробу?
Ці гароху троху?
Ці ярыцы паўмяліцы?
Ці грыкі чаравікі?

**З народнага; больш вершаў на dzietki.org**

КЕМІКІ

**Замяні літары так, каб выйшла новае слова**

**Б**аравік
Тв**о**р
**А**бл**о**кі
**Л**іска
**П**асьба
Трэска

**Склала Валянціна Карнялюк**



Паводле апошніх падлікаў, колькасць ахвяр землятрусу ў сталіцы Гаіці, Порт-о-Прэнсе, склала 150 тысяч чалавек. Нялёгка даводзіцца і тым, хто выжыў: на фота хлопец, які атрымаў прадуктовы паёк, адбіваецца ад суайчыннікаў.

REUTERS



22 студзеня актывісты Маладых Хрысціянскіх Дэмакратаў і Моладзі БНФ адзначылі ўгодкі пачатку паўстання Каліноўскага. У розных раёнах Мінска на заснежаных схілах з'явіліся патрыятычныя надпісы чырвонай фарбай. «Ціхія Міроны» — старонка 8.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ



Спявачка Жанэт выйшла замуж. Шлюбная цырымонія прайшла 23 студзеня ў Мінску. Яе абраннік, Павал Сарока, з'яўляецца чэмпіёнам краіны па сілавым шматбор'і.



PHOTO.BYMEDIA.NET

У Нацыянальнай школе харства ў Мінску прайшоў кастынг на ўдзел у Нацыянальным конкурсе харства «Міс Беларусь — 2010».



PHOTO.BYMEDIA.NET



Беларусы скачуць праз вогнішча ў чэрвені, на Купалле. Жыхары іспанскай вёскі Сан-Барталамеа робяць гэта ў сярэдзіне студзеня, на дзень святога Антонія. Прычым на конях.

## АНЕКДОТЫ

* * *

...І на заканчэнне нашай плённай канферэнцыі, падсумуем яе асноўны вынік. У выступленнях нашых паважаных дакладчыкаў было выкарыстана літар А — 597706, Б — 33676, В — 235678, Г — ...

* * *

Бывалы камп'ютаршчык — пачаткоўцу: «Самае галоўнае падчас працы з камп'ютарам — не даць яму зразумець, што ты спяшаешся...»

* * *

Калі жыццё дало расколіну, не трэба ліць у яе гарэлку.

* * *

— Хлопчык ці дзяўчынка? Дзяўчынка ці хлопчык?...

— Ды схадзіце на УГД...

— Ды не, мы выбары ва Украіне абмяркоўваем!...

* * *

— А дзе ўсе тваe?

— Тата з мамай у рэстаран пайшлі, да некага на юбілей. Дзед — у клубе ў начную...

— Нічога сабе ў цябе дзед прасунуты!

— Ды не... Ён уначы дзіцячы клуб вартуе.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Справа Гродз. губ.** Спаравецкія сяляне, жадаючы прыкупіць колькі дзесяцін дворных пожняў, каторыя заходзілі паміж іх лугоў, залажылі ў гасударственным банку сваёй самай найлепшай зямлі (пазычкі выдалі ім усяго па 50 рубл. на дзесяціну). У першым гаду рату ў банк заплацілі акуратна, але за апошнія два гады плаціць адмовіліся, кажучы, што гэта спрадвеку іх зямля, дык за што ж за яе яшчэ плаціць? Як ні растлумачвалі ім, што трэба ж доўг банку заплаціць, нічога не памагло. Цяпер банк забраў іх найлепшую зямлю, разбіў на хутары і прадае па 90—100 руб. за дзесяціну.

**«НН». №4. 1910.**

**У Малінаўшчызне — «жывуць».** Што беларусы могуць і ўмеюць выпіць — гэта праўда. Але ж нельга заходзіць так далёка, як гэта робіць беларуска-амерыканскае СП «Малінаўшчызненскі спірта-гарэлачны завод», рэкламуючы сваю гарэлку «Аквадзіў». Вытворцы гэтага напою дарэкламаваліся да таго, што напісалі на этыкетцы: «Аквадзіў» — гэта глыток жыцця, гэта цяпло, якое саграваe цела». Ці мо беларусы ўжо без такіх глыткоў жыць не могуць?

**«НН». №4. 2000.**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6305.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 27.01.2010.
Замова № 406.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614